3 ☜ а. МІХАІЛ НЕГЯРЭВІЧ



*Раздвоены тыдзень царкоўнай музыкі...*

# Ніва

## ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

МІКАЛАЙ БУШКО ☞ 3



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2558) Год L | Беласток, 22 мая 2005 г. | Цана 2,00 зл.

*Галоўны стэнд стане перад школай. На ім будзе памешчана карта Ягуштова, гісторыя мясцовасці, інфармацыя пра школу і наваколле. Вядома, на трох мовах: беларускай, польскай і англійскай...*

# Люблю мой край...

**У мінулым годзе, калі я наведала школу ў Ягуштове, Ігар Лукашук, настаўнік беларускай мовы, спяшыў у Беласток на курсы прысвечаныя школьна-грамадскім праектам. Як былы шэф Звязу беларускай моладзі, ведаў ужо як раздабыць сродкі на дзейнасць, аднак шукаў магчымасцей, вучыўся.**

**Сёння сустракаемся, каб пагутарыць пра яго краязнаўча-адукацыйны праект: „Ягуштова — прызабыты свет”. Сродкі на дзейнасць школа атрымала ад Фонду падтрымкі вёскі (Fundacja Wspomagania Wsi).**

**— Хочам захаваць мікратапанімы, — кажа Ігар Лукашук.**

Што гэта абазначае на практыцы? Запішуць усе назвы палёў і ўрочышчаў ды памесцяць іх на плане мясцовасці. Паколькі ў школе вучні з усёй Бельскай гміны (каля 56 вёсак), праект засяродзіўся на Ягуштове — сяле з мяшчанскімі традыцыямі, духовай культурай і славутымі выхадцамі. Праца ўжо пачалася. Значыць так: школьнікі ходзяць у народ — найлепшыя інфарматары гэта дзядулі, бабулі, пакаленне дзядоў. Пытаюць як **па-своему** калісь называлі той, або іншы кут, рэчку, луг... Пасля рысуюць карту мясцовасці і значаць яе адшуканымі словамі.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Ігар Лукашук са сваімі краязнаўцамі*

Падрыхтоўка такога плана патрабуе дакладна назваць усе дэталі: усе кварталы вёскі, дарожкі, прыналежныя палі, лугі, лес, рэчку, багну. Гэта не ўсё. Наадварот — зараз прыходзіць самы цікавы момант. Аўтар можа выказацца мастацкімі і літаратурнымі здольнасцямі. Словам, апісаць ды растлумачыць адкуль усё пачалося, прывесці легенду або гісторыю гэтага маленькага фрагмента роднага наваколля. Хоць у першую чаргу праект працуе на Ягуштова, кожны вучань абавязаны апрацаваць сваю родную вёску. Настаўнік паказвае мастацкі план Марціна Пятроўскага з Пасынак. Яго карта багатая дэталямі, прыгожая як „графіка на сцяну”.

— Марцін збіраецца ў Супрасльскі мастацкі ліцэй, — адзначае Ігар Лукашук, — заўтра павязе дакументы ў новую школу. — Настаўнік таксама перажывае за поспех Марціна.

Сярод пасынкаўскіх тапанімаў бачым „Жыдовэ поле” — пад ім паясненне: *поле, якое абрабляў калісь мясцовы жыд* (добра назваць яго прозвішча і наогул распытацца пра лёс і гісторыю гэтай сям'і). Іншыя назвы — ад прозвішчаў або мяну-шак гаспадароў і ўласнікаў, часам смешныя, таемныя, незразумелыя.

— У нас ёсць поле „Пііліповэць”, — кажа Эвеліна Вышкоўская з Ягуштова — гэта памятка аб пану, які меў тут свой маёнтак. Ёсць таксама „Міжгоры”, якія часам завуць „Міжгор'ем” і ўрочышча „Любка”. Апошні мілагучны тапанім ад аднайменнай рэчанькі.

Пытаю ці пры нагодзе адкрылі для сябе нешта новае — можа легенды, казкі?

— Ёсць легенда пра ўрочышча „Боровіска”. Там і сёння выцякае крыніца і стаіць каплічка. Кажуць, раней там знаходзілася Ягуштова. Людзям жылося цяжка, крыніца час ад часу залівала панадворкі. З цягам часу людзі перайшлі на іншае, сухое месца. Сучасны назоў атрымалі дзякуючы каралю Зыгмунту Аўгусту (імя Аўгуст — па-падляшску Ягуштын). Кароль меў спыніцца тут у час падарожжа з Кракава ў Вільню. На адпачынак. Уражаны гасціннасцю і культурай жыхароў, прысвоіў ім гарадскія правы. Сцяпан Навіцкі, мясцовы старажыл, апавядаў ім у час адной школьнай сустрэчы, што каралеўская грамата прапала ў час бежанства. Яна — паводле інфарматара — не загінула. Даказваў, што пасля II сусветнай вайны бачылі яе ў адным з музеяў Варшавы. Уся тэма — выклік ягуштоўскім краязнаўцам!

Часам гімназісты пытаюць: калі будзе пра нашу вёску? Ігар Лукашук адказвае: калі апрацуем Ягуштова, зоймемся парафіяльнымі вёскамі, пасля іншымі. Працы тут, хоць адбаўляй!

Аднак вернемся да апісання праекта. З сабраных і апрацаваных інфармацый моладзь падрыхтуе адукацыйна-турыстычную сцежку, пазначаць яе інфармацыйнымі таблііцамі па-беларуску (урочышчы будуць запісаны ў арігінале — „па-свому”, кірыліцай), па-польску і па-англійску. Галоўны стэнд стане перад школай. На ім будзе памешчана карта Ягуштова, гісторыя мясцовасці, інфармацыя пра школу і наваколле. Вядома, на трох мовах: беларускай, польскай і англійскай.

— Каму яна будзе патрэбна? Перш за ўсё моладзі, якая астанецца тут жыць. — Пра жыццё ў сваёй роднай мясцовасці марыць выдатніца (лаўрэатка прадметнага конкурсу па беларускай мове) Эвеліна Вышкоўская.

— Тыя, што астануцца тут жыць, можа зоймуцца агратурызмам, — думае ўголас Ігар Лукашук. Усе веды пра мясцовасць і наваколле паслужаць падмацаванню нацыянальнага гонару, паўнацэннасці, нармальнасці.

Дырэктар школы, Юры Жменька, не скрывае слоў пахвалы ў бок аўтара праекта і сваіх навучэнцаў. Дзякуючы ім школа будзе вылучацца не адно сучасным выглядам і задбанасцю — як зараз — але ідэямі на меру XXI стагоддзя.

**Ганна Кандрацюк**

## Якая перамога?

☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

*Прадметам асаблівага гонару ёсць той факт, што ў другой сусветнай вайне загінуў кожны трэці жыхар нашай зямлі. Але гэтая жахлівая лічба чалавечых страт для кожнага нармальнага чалавека не можа быць прадметам гонару, бо гэта прадмет беларускай бяды, прадмет нацыянальнай катастрофы...*

## Атака на палякаў

☞ 2

Мацей Халадоўскі

*Уявіце: найвышэйшыя польскія дзяржаўныя ўлады забаранілі ўзначальваць, напрыклад, Беларускае грамадска-культурнае таварыства Яну Сычэўскаму. Альбо: улада ўслухоўваецца ў г.зв. голас люду (значыць, па прынцыпе, сама ў сябе, бо ж люд ёй даў легітымнасць у выніку выбараў) і звальняе галоўных рэдактараў „Жэчыпаспалітай”, „Выбарчай”, „Кур'ера параннага” ці хоць бы і нашай „Нівы”...*

## Няма віноўных

☞ 4

*Пракурор Д. Альшэўскі: Асобы, якім ставіўся закід забойстваў праваслаўнага насельніцтва, намагаліся выбараніцца з некаторых учынкаў. Яны інакш адносіліся да нападаў на міліцыю і войска, а інакш да нападаў на мірнае насельніцтва. Жаўнеры — як называюць іх адны, ці партызаны — як*



*называюць другія, або бандыты — як акрэсліваюць іх яшчэ іншыя, асабліва бараніліся перад інкрымінацыяй ім удзелу ў атаках на мірнае насельніцтва...*

## Горад Орля

☞ 9

Міхал Мінцэвіч

*Орлі сёння каля пяціста гадоў, з ліку якіх каля трохсот была яна горадам. Першыя весткі пра Орлю датуюцца пачаткам XVI стагоддзя. У 1507 годзе Орля была прысвоена Яну Іванавічу, а пасля шляхам сямейных парадненняў апыналася ў руках м.інш. Багавітыновічаў, Тэнчынскіх, Алелькавічаў, Радзівілаў, Браніцкіх, Вітгенштэйнаў. Найбольш роскіт прайшла Орля пад панаваннем Радзівілаў...*

## Лёс кантрабандыста

☞ 10

Сымон Нальшанскі

*— Нам, кантрабандыстам, грэх скардзіцца на лёс, — пераехаўшы мяжу заявіў свайму калегу загарэлы парушальнік мытнага права з дзесяцігадовым стажам гэтай небяспечнай прафесіі. — Тым хто нас праверае, стала жыць яшчэ больш невыносна, чым нам. Мне іх часам бывае нават шкада. Нарабілі зараз усялякіх спецслужбаў, якія цікуюць за супрацоўнікамі мытні як воўк за авечкамі...*



# Скокі на касцях

*Брытанскі палітык Нэвіл Чэмберлен казаў: „У вайне не бывае пераможцаў, ёсць толькі прайграныя". З гэтым нельга не пагадзіцца, бо кожная вайна — гэта мноства нявінных ахвяр, безліч зламаных, скалечаных лёсаў. Другая сусветная вайна не можа быць тут выняткам. Але апошнія два ці тры месяцы ў расійскіх і асабліва беларускіх сродках масавай інфармацыі чуем і назіраем сапраўдную істэрыю з нагоды перамогі СССР над Нямеччынай шэсцьдзесят гадоў таму. Расіян то яшчэ можна зразумець, паколькі ганарыцца ім у сваёй гісторыі, якая спрэс складаецца з заваёўных крывавых войнаў, асабліва няма чым, ды і другая сусветная вайна для іх была сапраўды айчыннай. Што ж датычыць Беларусі, то сутнасць гэтай вайны для нас куды складанейшая. Наўрад ці можам лічыць яе айчыннай, бо, беларусы, заціснутыя паміж сталінскай вынішчальнай машынай і фашыстоўскімі войскамі, змагаліся, як часта бывала ў нашай гісторыі, зусім не за свае інтарэсы. Асабліва, што датычыць Заходняй Беларусі, дзе масавага савецкага патрыятызму не магло быць у прынцыпе.*

*Днямі спаткаў я на вуліцы спадарыню Н., разгаварыліся. У яе зусім іншае ўспрыманне гэтай вайны, чым у дзяржаўных прапагандыстаў. Яе бацьку-франтавіка пасля 1945 г. зрабілі ворагам народа і выслалі ў савецкі канцлагер. Лёс досыць тыповы для беларусаў, такіх праўдзівых жыццёвых гісторый шмат. Пераважная бальшыня сапраўдных ветэранаў-франтавікоў ужо паўмірала, прычым амаль усе ў бядноце. Ніхто з ветэранаў-беларусаў, якіх давялося ведаць, не любіў расказваць пра тую жахлівую вайну. Так сама, як ніхто з удзельнікаў савецка-афганскай вайны ніколі вам не будзе пра яе апавядаць. Бо вайна — гэта не паказушны гераізм, вайна — гэта смерць і кроў, боль і слёзы. Хто ж тады не вылазіць з экранаў тэлевізараў, пачэсных залаў і цэнтральных пляцаў нашых гарадоў? Значная частка такіх ветэранаў — гэта рознага кшталту штабісты, стралкі з так званых «заградотрядов» (тыя, што стралялі ў плечы, уздымаючы «масавы гераізм»), энкавэдысты і, здаецца, ужо нават іх дзеці, якія ў вайну былі падлеткамі. Як той казаў, «не стареющ душой ветэраны, бо не мелі на целе ні раны». Гэты слой удзельнікаў вайны жыў няблага і ў савецкія часы. Кожны з іх атрымаў ад дзяржавы па дзве-тры кватэры, меў усялякія льготы. А за апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі яны пераўтвораны ў сапраўдную касту, жывых ідалаў, якім патрабуюць бясконца пакланяцца (з гісторыі мы добра памятаем словы «спасибо товарищу Сталину за счастливое детство»). Тыя ж з іх, хто сапраўды ваяваў і зацята расказвае пра гэта сёння, вартыя шчырага жалю, бо гэта людзі, для якіх вайна так і не скончылася. Яны біялагічна і люта ненавідзяць усё, што хоць крыху выбіваецца з іх савецкага светагляду. Для іх у палітычным жыцці ёсць толькі два колеры: камуністычны — чырвоны і фашыстоўскі — карычневы. Асэнсаваць сам факт, што на былой савецкай прасторы могуць жыць і развівацца нейкія іншыя дзяржаўныя ўтварэнні, па-за іхным разуменнем света. Дзе ўжо ім зразумець пазіцыю краін Балтыі, якія называюць рэчы сваімі імёнамі і цвёрда ставяць пытанне пра савецкую акупацыю. Катэгарычна такія ветэраны супраць таго, каб паставіць крыжы і памятныя знакі на брацкіх магілах загінуўшых немцаў. Нават думаць не хочуць, што палеглыя нямецкія жаўнеры — гэта таксама няшчасныя ахвяры фашызму.*

*Беларуская ж сённяшняя дзяржава ладзіць сапраўдныя „скокі на касцях". Маштабы святкавання набылі абсурдны характар, выдаткі на яго велізарных памераў. Прадметам асаблівага гонару ёсць той факт, што ў другой сусветнай вайне загінуў кожны трэці жыхар нашай зямлі. Але гэтая жахлівая лічба чалавечых страт для кожнага нармальнага чалавека не можа быць прадметам гонару, бо гэта прадмет беларускай бяды, прадмет нацыянальнай катастрофы. Да хрысціянскага ўшанавання памяці гэтай дзяржаве вельмі далёка. А ўсё сапраўды беларускае яна ненавідзіць. У тым ліку і беларускіх ветэранаў вайны. Успомнім хаця б як цкавалі нашых пісьменнікаў-франтавікоў Аляксея Карпюка і Васіля Быкава, як ганьбяць нашых эмігрантаў, што ратавалі і рабілі беларускую справу падчас і савецкай, і нямецкай акупацый. Але час раскрывае ўсё больш праўды пра гісторыю. І калі нашы людзі даведаюцца больш праўды пра другую сусветную вайну, „скокі на касцях" скончацца, а застанецца нармальная чалавечая Памяць.*

**Уладзімір Хільмановіч (Гродна)**

# Калгас „Чэлсі"



*У сёлетнім чэмпіянаце Англіі „досрочную трудовую победу" заваявала „Чэлсі". Чэлсі гэта і багаты квартал Лондана, і назва футбольнай каманды. Каманда шмат гадоў змагалася ў вышэйшай англійскай лізе за „победу", але беспаспяхова. Да мінулага сезона, калі падмацаваў яе сібірскім петракапіталам Раман Абрамовіч.*

*Раман Абрамовіч з'яўляецца імем і прозвішчам аднаго „новага рускага", малалкава разбагацелага 36-гадовага мільярдэра. У сённяшніх рэаліях маскоўскай дзяржавы гэта не толькі адно імя і прозвішча аднаго чалавека. „Nec Hercules contra plures" — заўважылі ўжо старажытныя рымляне і гэтае правіла дзейнічае па сённяшні дзень. Так і ў выпадку Абрамовіча. Не сам адзін ён заваяваў лічанае ў паўтара дзесятка мільярдаў долараў багацце, але прыклалі да гэтага рукі і іншыя асобы, вядома — даволі важныя, з Крамля. Таму ягонае прозвішча з'яўляецца не толькі ягоным прозвішчам, але ў сапраўднасці прыкрывае своеасаблівы від калектыўнай гаспадаркі, дзе „колхозникам" належыцца ад фармальнага ўласніка „откат" — што ў тамашнім крымінальным жаргоне абазначае свайго роду пай чыноўнікам, якія афармілі перавод тых мільярдаў на яго рахунак. Гэты пай не толькі ў грошах, але — так як і ў тыповых мафійных структурах — некаторае ганаровае абавязацельства ўдзячнасці сваім дабрадзеям.*

*У апошнім часе найбольш вядомым „новым рускім" з'яўляецца Міхаіл Хадаркоўскі, які апальна запатрабаваў ад крамлёўскай вярхушкі вызвалення яго ад выплаты грашовай і ганаровай даніны сваім дабрадзеям. Ён ужо абвінавачаны ў махлярстве і пакуль сядзіць за краткамі. Але за ягоныя вялікія грошы адбываецца даволі заўзятае змаганне, дзе ў ход пускаюцца і дэмагагічныя лозунгі, напрыклад, „забіраюць у тых, што зараблялі мільярды, каб аддаць тым, што крадуць мільёны". Мабыць, у Маскве „зарабляць" і „красці" гэта сінонімы. Супольнік Хадаркоўскага Неўзлін прадбачліва збег у Ізраіль...*

*Іншыя новыя расійскія багацеі, якія дабіліся мільярдаў такім жа самым чынам, але сядзяць ціха, у махлярстве не абвінавачваюцца. У іх ліку і згаданы ўжо Абрамовіч, якога фармальна ахоўвае імунітэт губернатара Чукоткі. Сакрэтам палішынеля з'яўляецца крамлёўская забарона кантрольным органам заглядаць у яго справы. Леанід Неўзлін раскрывае, што ідэю замены апальнага калісь Ельцына нейкім давераным чалавекам выказаў Барыс Беразоўскі (колішні сакратар Саюза Беларусі і Расіі, які ўжо збег у Англію), а кандыдатуру Пуціна ў якасці Ельцынавага наследніка ці не запрапанаваў менавіта Абрамовіч, які ў той час быў бліжэйшым фінансавым дарадчыкам Ельцынавай дачкі Тані.*

*Расійскія алігархі стараюцца пераваліць „заробленыя" грошы ў замежжа, далей ад сваіх суайчыннікаў, якія ў расійскіх умовах маглі б іх „перазарабіць". Абрамовіч — ці мо хто іншы з Ельцынавых „правых рук" — на „Чэлсі" выдаваў у сярэднім па мільёне долараў у дзень! Акрамя таго купіў ён у Лондане раскошны дом у суседстве з Маргарэт Тэтчэр; у Лондане жыве і Ельцынава Таня. Апраўдваючыся перад маскоўскім судом, Хадаркоўскі тлумачыўся, што ён усе свае грошы ўкладваў ва ўнутраны бізнес, не раскідваючыся імі ні на куплю футбольных каманд, ні багатых палацаў, ні яхтаў з верталётамі, ні мініпадлодак... Але хіба загадзя вядома, што „Москва слезам не верит".*

*Я невыпадкова кранаю расійска-футбольныя справы. Шмат якія беларусы з'яўляюцца балельшчыкамі Расіі, а хіба найбольш вядомым з іх з'яўляецца найбольш вядомы сапраўдны калгаснік. Аляксандр Рыгоравіч столькі патраціў свайго каштоўнага часу (пра сродкі не згадваючы, бо яны дзяржаўныя) на хадайніцтвы дзеля пасялення ў багатых крамлёўскіх салонах. Столькі тостаў, чарак і „братских лобзаний" з Барысам Мікалаевічам. Ці не балелі мы за яго? І ўсё быццам галавою аб крамлёўскі мур. Бо каму быў у Маскве патрэбны калгасны чалавек, які рваўся ўсё раскарумпіраваць, прапануючы бізнес-план „Дай" і русіфікацыю русіфікаванага? Ні Ельцынавай сям'і, ні тамашнім „колхозам"; ім быў патрэбны нехта памяркоўна строгі, давераны, накшталт англійскага джэнтльмена. А пакуль выдварым „восвояси" нашага героя са Свята Перамогі; як бамжоў без „племени-роду". Але што будзе, калі „колхозники" захочуць і ў Мінску ўстанавіць „джэнтльменскія" парадкі?*

**Аляксандр Вярбіцкі**

Вачыма еўрапейца

# Чарга за палякамі



*Уявіце, вось, сабе такую сітуацыю, што найвышэйшыя польскія дзяржаўныя ўлады забаранілі ўзначальваць, напрыклад, Беларускае грамадска-культурнае таварыства Яну Сычэўскаму. Альбо, яшчэ іншую. Улада ўслухоўваецца ў г.зв. голас люду (значыць, па прынцыпе, сама ў сябе, бо ж люд ёй даў легітымнасць у выніку выбараў) і звальняе галоўных рэдактараў „Жэчыпаспалітай", „Выбарчай", „Кур'ера паранннага" ці хоць бы і нашай „Нівы". Пэўна, тады мы сказалі б: гэтага немагчыма ўявіць, гэта ўвогуле немагчымае, гэта абсурд, гэта быў бы нейкі кашмар.*

*А калі бачым падзеі вакол Саюза палякаў Беларусі, аказваецца, што такія дзеянні ў Еўропе 2005 года магчымыя. Вось аж Міністэрства юстыцыі Беларусі палічыла сакавіцкі з'езд Саюза палякаў няважным і загадала яго паўтарыць. Азначае гэта неабходнасць выбару ўлад іншых, чым былі выбраны на сакавіцкім з'ездзе СПБ з Анжалікай Борыс у якасці старшыні. Міністэрства спасылалася быццам бы на пратэсты дэлегатаў з'езда.*

*Той кур'ёзны ў сусветным маштабе скандал пракаменціравалі зараз жа маршалак польскага Сената Лонгін Пастусяк і шэф МЗС у Варшаве Адам Ротфельд.*

*— Пазіцыю беларускага Міністэрства юстыцыі лічым парушэннем фундаментальных правоў нацыянальных меншасцей. Яно — нязгоднае са стандартамі АБСЕ і Савета Еўропы, — сказаў маршалак Сената.*

*— Гэта незаконныя дзеянні, ламанне шматбаковых і двухбаковых абавязацельстваў. Нельга гэту справу пакінуць самой сабе, — запэўніваў шэф польскага знешнепалітычнага ведамства.*

*Рашэнне беларускага Міністэрства юстыцыі ўпісваецца ў шырэйшую палітыку Аляксандра Лукашэнкі перад маючымі адбыцца ў наступным годзе прэзідэнцкімі выбарамі і разломнымі, незалежніцкімі працэсамі ў краінах, якія ў апошнія гады застаюцца ў г.зв. шчыльных стасунках з Расіяй. Прэзідэнт Лукашэнка эліміне на чарзе ўсе нявыгадныя яму партыі і арганізацыі ды іх лідэраў. Цяпер чарга за Саюзам палякаў Беларусі. Нічога тады дзіўнага, асабліва таму, што — на думку Мінска — палякі могуць быць небяспечнымі для захавання ўлады Лукашэнкам і ягоным апаратам, асабліва бяспекі, што паказалі падзеі ва Украіне. І гэта без разрознення, ці гэта палякі тамтэйшыя, ці тутэйшыя. Палякі на Гродзеншчыне пры падтрымцы Варшавы маглі б давесці да такога мяцяжу, як ва ўзбекскім Андыжане. Як выказваўся ў апошнія дні на старонках „Кур'ера паранннага" Тадэвуш Гавін, першы старшыня СПБ, „было ўчынена ўсё тое для таго, каб вярнуць да ўлады старое кіраўніцтва саюза, якое да гэтай пары верна служыла рэжыму". Тут Тадэвуш Гавін думаў аб адхіленым ад пасады старшыні СПБ у сакавіку Тадэвушу Кручкоўскім. Усё гэта ўпісваецца ў напругі, да якіх штораз часцей даходзіць на лініі Масква — Варшава і Варшава — Масква. Мабыць, прэзідэнт Лукашэнка не хоча быць горшы. Аднаго ён не памятае, што, у адрозненні ад вопытнага, хоць, здавалася б, час ад часу нахабнага Уладзіміра Пуціна, вядзе ён палітыку з рашуча рэжымнымі прыкметамі і гэта бачыцца светам, што паказалі Вашынгтон і Брусель. Таму тыя антыпольскія дзеянні ў Беларусі ўпісваюцца галоўным чынам у імідж — як гэта называецца — беларускай дыктатуры. У сувязі з гэтым, думаю, палякі ў Беларусі павінны паводзіць сябе разважліва, каб не даць Аляксандру Лукашэнку ніякага прапагандыскага аргумента. Прытым рабіць сваё згодна з дэмакратычнымі прынцыпамі і не паддавацца ніякаму націску. Жадаю поспеху.*

**Мацей Халадоўскі**

# Яднае іх царкоўная музыка.

*М. Негярэвіч: Хоры, што выступяць на нашым фестывалі павінны трымацца царкоўных канонаў...*

**Інтэрв'ю з мітрафорным протаіерэем Міхаілам НЕГЯРЭВІЧАМ, дырэктарам Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі".**

***— 22 мая адкрыецца Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі. Што прадбачваецца на гэты дзень?***

— У нядзелю 22 мая адбудуцца ў Гайнаўцы ўрачыстыя святкаванні. Апрача святкавання Уваскрэсення Гасподняга будзем адзначаць мясцовае прыхадское свята прысвечанае свяціцелю Мікалаю Цудатворцу. Ранейшая драўляная царква была збудаваная ў гонар гэтага ўгодніка Божага і зараз прысвечана яму ніжняя царква нашага Свята-Троіцкага сабора. Прадбачваем, што на святкаваннях будуць мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, епіскап Гайнаўскі Міран, епіскапы з Грузіі і Балгарыі. Пасля царкоўных урачыстасцей у рамках фестывалю і ў супрацоўніцтве з Еўрарэгіёнам „Белавежская пушча" будзе арганізаваны ў 15 гадзін для гайнавян канцэрт. Перад публікай выступяць хоры, лаўрэаты мінулагодняга фестывалю — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы і Хор Каталіцкага Люблінскага універсітэта, якія запрэзентуюць царкоўную і свецкую музыку. Урачыстае адкрыццё Міжнароднага фестывалю адбудзецца ў 18 гадзін у Свята-Троіцкім саборы. У храме мінулагоднія лаўрэаты, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі ўсходняй і заходняй традыцый, выступяць з царкоўнай музыкай.

***— Конкурсныя выступленні будуць праходзіць з 24 па 28 мая. Ці вялікую частку будуць састаўляць замежныя хоры?***

— У гэтым годзе будуць прэзентавацца харысты з 11 краін. На 32 хоры, якія прымуць удзел у фестывалі, выступяць ажно 23 замежныя калектывы.

***— На якія хоры ўжо зараз можна звярнуць увагу?***

— Выступіць многа хораў, якія пакажуць багацце і прыгажосць царкоўнага спеву. Разнародны рэпертуар у Мітрапаліцкага хора „Nekressi" з Грузіі. Прэзентуе ён высокі мастацкі ўзровень. Пры іншых нагодах выконвае таксама народную музыку і танцы. Варта было б заўважыць удзел Камернага хору Фонду камернай і арганнай музыкі, які дзейнічае пры рымска-каталіцкім прыходзе Узвышэння Крыжа Гасподняга ў Гайнаўцы. Удзельнічае ён у многіх конкурсах і прыгожа спявае. Цешыць нас, што ў Гайнаўцы ёсць супрацоўніцтва паміж прадстаўнікамі праваслаўнай і каталіцкай канфесій. З Англіі прыедзе Мужчынскі кафедральны хор з Лондана. Спявае ён па-славянску, а адзін з харыстаў выводзіцца з Белавежы. Школу візантыйскага спеву пакажа хор Адукацыйнага музыкалагічнага таварыства з Афінаў.



***— Побач праваслаўных прыходскіх хораў выступяць на фестывалі свецкія хоры і прадстаўнікі іншых канфесій. Ці ўсе выканаўцы будуць прэзентаваць кананічны царкоўны спеў?***

— Вельмі добра, што штораз больш людзей зацікаўленых усходняй традыцыяй. Кожны хор стараецца мець у сваім рэпертуары царкоўную музыку. Царкоўны спеў не з'яўляецца канцэртам, а своеасаблівым сакрум, малітвай нашай Царквы. Трэба брацца за яго са знаёмствам царкоўных канонаў. Наватарства ў царкоўным спеве павінна абмяжоўвацца пэўнымі рамкамі, за якія нельга выходзіць. Царкоўная музыка павінна разбуджваць да малітвы і выклікаць спакой на душы. Нельга царкоўным спевам расстройваць душы. Свецкія хоры, якія хочуць выступаць на канцэртах з царкоўнай музыкай, шукаюць праваслаўных кансультантаў для падборкі рэпертуару. Я сам быў кансультантам свецкага вроцлаўскага хору і даваў ім лекцыі духоўнасці. Гэтыя хоры, што выступяць на нашым фестывалі, павінны трымацца царкоўных канонаў. Конкурсная камісія будзе ацэньваць не толькі мастацкасць выступленняў выканаўцаў, але таксама падбор рэпертуару і ўсе іншыя справы.

***— У мінулым годзе сярод пераможцаў было многа хораў з Беларусі. Якія беларускія хоры выступяць у гэтым годзе?***

— Так склалася, што апошнімі гадамі галоўную ўзнагароду, Гран-пры атрымлівалі хоры з Беларусі. У гэтым годзе было многа заявак з Беларусі. Выбралі мы шэсць найлепшых, на нашу думку, хораў. Будуць выступаць у конкурснай частцы Кафедральны хор прыхода Усіх святых Беларускай зямлі з Гродна, Дзіцяча-маладзёжны хор „Удахнавенне" з Оршы, Жаночы хор Манастыра св. Елізаветы з Мінска, хор прыхода Апекі Божай Маці з Руднік, хор „Праабражэнне" са Шчучына і славуты Дзяржаўны хор Радыё і тэлебачання Рэспублікі Беларусь з Мінска. Яго дырыжорам з'яўляецца выпускнік духоўнай семінарыі Віктар Роўда, які патрапіць перанесці духоўнасць на сваіх харыстаў.

***— Дзякую за размову.***

**Інтэрв'ю і фота Аляксея Мароза**

*М. Бушко: Людзі, а сярод іх многа святароў, да гэтай пары не могуць зразумець, чаму фестываль не можа адбывацца ў Гайнаўцы...*



**Размова з Мікалаем БУШКО, дырэктарам Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка 2005".**

***— З 24 па 29 мая ў Беластоцкай філармоніі будзе адбывацца XXIV Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі арганізаваны Фондам „Царкоўная музыка". Як будзе праходзіць мерапрыемства?***

— Традыцыйна адкрыем гэты Фестываль урачыстым інаўгурацыйным канцэртам, у якім пачуем канцэртную версію Літургіі св. Іаана Златавуста з музыкай Пятра Чайкоўскага (як прыклад укладу вялікіх кампазітараў Усходу ў духоўную і мастацкую спадчыну Вялікага княства Літоўскага — часткі Рэчы Паспалітай многіх народаў). Як сімвал выканаюць гэты канцэрт два знакамітыя хоры, нашы лаўрэаты — літоўскі хор „Brevis" з Вільні пад кіраўніцтвам Гінтаўтаса Венісловаса і польскі хор „Bel Canto" з Ольштына, пад кіраўніцтвам выдатнага нашага земляка, бяльшчаніна Янкі Палавянюка. Музыка да літургіі кампазіцыі Чайкоўскага будзе ўпершыню поўнасцю выконвацца ў Польшчы. Робім гэта ў 165 гадавіну з дня нараджэння гэтага вялікага музыканта. У сёлетнім фестывалі звернем таксама ўвагу на юбілей эстонскага кампазітара Арво Парта, а перад усім на юбілей аднаго з выдатнейшых польскіх кампазітараў Рамуальда Твардоўскага, звязанага з фестывалем ад 23 гадоў, які ў гэтым годзе святкуе 75-годдзе з дня нараджэння. У час фестывалю будуць выкананы амаль усе яго вакальныя творы царкоўнай музыкі створаныя для хору. У дадатковым канцэрце арганізаваным 28 мая (у суботу) пачуем інструментальныя і інструментальна-вакальныя творы інспіраваныя царкоўнай музыкай, а сярод іх „Малую праваслаўную літургію" створаную ў 60-х гадах на хор і аркестр, якую выканаюць хор „Cantica Cantamus" пад кіраўніцтвам Віялеты Бялецкай, разам з сімфанічным аркестрам Беластоцкай філармоніі і ўдзелам польскага славутага баса Леанарда Анджэя Мроза. Канцэрт павядзе славуты дырыжор Сілезскай філармоніі Міраслаў Яцэк Блашчык. Традыцыйна беластоцкай і прыезджай публіцы прадставім многія аматарскія і прафесійныя, свецкія і царкоўныя хоры, у ліку якіх будуць прадстаўнікі сямі праваслаўных цэркваў. Спадзяемся выступленняў 29 хораў з 15 краін свету.

***— У час фестывалю будзе выконвацца царкоўная музыка розных кампазітараў. Ці ўся яна з'яўляецца кананічным спевам, які можна выкарыстаць у праваслаўных цэрквах?***

— Царкоўная музыка гэта малітвы, да якіх хтосьці стварыў музыку. Царкоўную музыку стваралі кампазітары ў мінулым, а таксама ствараюць сучасныя кампазітары. Калі гаварыць пра кананічнасць, то гэта адносіцца, па-мойму, перад усім да слоў. Многія царкоўныя кампазіцыі стварала і выконвала душа чалавека. Нічога дзіўнага, што ад дзесяці гадоў многія людзі наш фестываль называюць фестывалем спяваючай душы. Некалькі гадоў назад мне прыйшлося наведаць Святую зямлю. У Святым горадзе Іерусаліме я пачуў грэчаскую, армянскую, славянскую, эфіопскую і грузінскую царкоўную музыку, а ў горадзе Назарэце быў сведкам арабскага праваслаўнага шлюбу. Гэтыя ўражанні праз гады не давалі мне спакою. Хацелася ўсё гэта, хаця ў мініяцюры, паказаць на фестывалі. Многія гады намаганняў прынеслі плён і ў гэтым годзе прыязджае ізраільскі хор, які запрэзентуе царкоўную музыку ўсіх вышэйпералічаных плыняў. Прыедуць да нас таксама старaверы і грэка-каталікі. Арганізуючы фестываль у Беластоку сустракаемся з зычлівым падыходам многіх людзей — католікаў і праваслаўных, а сярод іх таксама многіх святароў, якія да гэтай пары не могуць зразумець, чаму фестываль не можа адбывацца ў Гайнаўцы. Свецкая формула нашага фестывалю дае нам магчымасць прадставіць поўную палітру царкоўнай духоўнасці і мастацтва. Чарговы раз рэалізуем тэзіс музычнага форуму Усходу і Захаду. Усе канфесіі яднае адно — царкоўны спеў, царкоўная музыка.

***— У мінулых гадах на Вашым фестывалі перапляталася выкананне царкоўнай музыкі з прэзентацыяй свецкай музыкі. Ці фестываль не ідзе ў напрамку мерапрыемства са свецкай музыкай?***

— Гэта няпраўда. Мы ніколі да гэтай пары не прэзентавалі свецкай музыкі. Заўсёды была гэта і ёсць тыпічная царкоўная музыка, якая ўзнікала ад найстарэйшых часоў да сучаснасці. Прапанавалі мы і прапануем таксама музыку інспіраваную праваслаўем, як хаця б „Малая праваслаўная літургія" Рамуальда Твардоўскага, „Гімн да св. Данілы" Кшыштафа Пэндэрэцкага ці „Адпяванне" Міхала Рагоўскага.

***— Як трэба разумець словы „музыка інспіраваная праваслаўем"?***

— Думаю, што музыка інспіраваная праваслаўем гэта сучасныя кампазіцыі, якіх не выконваецца ў цэрквах. Гэта інструментальная музыка на аркестр і інструментальна-вакальная музыка.

***— Дзякую за размову.***

**Інтэрв'ю і фота Аляксея Мароза**

## Папяросы, гарэлка, спірт

Напрыканцы сакавіка давялося мне пабываць на беластоцкай таўкучцы, што па вуліцы Юравецкай. Мінуўшы мост на рачулцы, адразу пачуў я воклічы: „Папяросы, гарэлка, спірт...”. Прытрымаўся недалёка і пачаў назіраць за тымі людзьмі. Яны наперамен паўтаралі тыя ж самыя словы ўсім прахожым, і калі нехта затрымліваўся, дык прапанавалі папяросы „Норд Стар” па 2,50 зл. за пачку, гарэлку — па 10-12 зл. за паўлітроўку і спірт па такой самай цане. Падобная сітуацыя маецца на базары па вул. Кавалерыйскай ды на таўкучцы пры „Мадра”. Прадаўцы, па-мойму, гэта не грамадзяне з-за ўсходняй мяжы, а нашы людзі — жыхары Беластока, бо ўсе папраўна размаўлялі па-польску.

Пакупнікі добра ведаюць аб тым, што папяросы і гарэлка паходзяць з нелегальнага гандлю. На жаль, надалей купляюць алкаголь невядомага паходжання, бо ён намнога танней каштуе чым у нашых крамах і, бывае, атручваюцца тымі спіртнымі напоямі.

У тэлебачанні ўжо не раз паказвалі аб выкрыцці нелегальнай прадукцыі алкаголю, але гэта не вырашае праблемы. Па-мойму, замала аб гэтым дбаюць ахоўнікі правапарадку ды такім гандлярам прысуджваюцца нізкія судовыя прыгаворы, бо гэта... малая шкоднасць для нашай дзяржавы. Улады адказныя за правапарадак у дзяржаве павінны прыкрыць нелегальны гандаль алкаголем ды папяросамі на базарах. Гэтую праблему ўздымаюць на сваіх старонках розныя газеты, але нашай уладзе гэта як гарохам аб сцену.

**Мікалай Лук'янюк**

## Як нас бачаць

Пры дарозе на пагранічны пераход Полаўцы — Пяшчатка ў вёсцы Чаромха знаходзіцца фірменная крама Сувальскага птушынага прадпрыемства „Курчак”, побач пункт продажу гародніны і фруктаў, а з другога боку — крама „Макс” беластоцкага прадпрымальніка. Паколькі крамы даволі добра абяспечаны і карыстаюцца ўвагай пакупнікоў па прычыне нізкіх цэн, дык кашмарам для іх з'яўляецца тое, як да іх дабрацца. Няма пад'езду, толькі адны калдобіны і баюры гразі ў час дажджлівага надвор'я. Машыну можна паламаць або боты згубіць у балоце.

Прадпрымальнікі не дбаюць пра інфраструктуру. Для іх лічацца адно прыбыткі ад прададзеных прадуктаў. А шкада. У народзе кажуць: „Як нас бачаць, так пра нас пішуць”.

Варта адзначыць, што асноўнымі пакупнікамі ў згаданых крамах з'яўляюцца госці з-за ўсходняй граніцы, бо дзеля іх былі яны ўстаноўлены і кругласутачна працуюць. Паколькі фірмы не дбаюць пра сваю рэпутацыю, дык можа мясцовы самаўрад паўплывае, каб гэтыя змянілі сваю візітную картачку. Да абсталяваных па-сучаснаму крамаў баюры на пад'ездах ніяк не падыходзяць. **(ус)**

# Жывых віноўных няма

**Размова з Дарыюшам АЛЬШЭЎСКІМ, пракурорам Беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці.**



***— У якой сёння стадыі следства ў справе масавых забойстваў насельніцтва былога Бельскага павета ў студзені і лютым 1946 года?***

— У стадыі парадкавання дакументаў для канчатковага вынясення пастановы ў гэтай справе. Акта справы сёння налічваюць чатырнаццаць тамоў. Канчатковае рашэнне абгрунтавана на сямідзесяці старонках, напісаць можна яшчэ больш, але думаю пра скарачэнне гэтага дакумента, бо ў вялікім аб'ёме губляецца пераканаўчасць фармуліровак. Трэба будзе ўключыць сюды фрагменты некаторых важных для справы паказанняў, каб не губляліся найважнейшыя высновы.

***— Калі прадбачваеце абнародаваць канчатковую пастанову?***

— Пад канец чэрвеня. Гэта канец нашага справаздаўчага тэрміну і хачу гэтую справу ўключыць у гадавую справаздачу загадчыка інстытута.

***— Значыць, яшчэ зарана падводзіць вынікі расследавання?***

— Канцэпцыя рашэння ўжо выспела, але не хачу яе абвяшчаць заўчасна, да афіцыйнай пастановы пра спыненне следства. Праект пастановы гатовы ў 95%, яшчэ хачу прыгадаць некалькі архіўных матываў.

Асобы, якім ставіўся закід забойстваў праваслаўнага насельніцтва, намагаліся выбараніцца з некаторых учынкаў. Яны інакш адносіліся да нападаў на міліцыю і войска, а інакш да нападаў на мірнае насельніцтва. Жаўнеры — як называюць іх адны, ці партызаны — як называюць другія, або бандыты — як акрэсліваюць іх яшчэ іншыя, асабліва бараніліся перад інкрымінацыяй ім удзелу ў атаках на мірнае насельніцтва.

Я трымаю кантакт з некаторымі людзьмі, якіх гэтая справа хвалюе, і яны стараюцца мне дапамагаць. Дакладна высвятліць, хто ўдзельнічаў у акцыях, не ўдаецца, але матывы дзеяння вядомыя. Не ўдалося таксама аднавіць з памяці дакладнага ходу ўсіх падзей, напр. даты сустрэчы „Бурага” з прадстаўнікамі камандавання акругі Нацыянальнага вайсковага задзіночання.

З-за вялікага зацікаўлення сродкаў масавай інфармацыі я думаю пра невялікую канферэнцыю для аб'яўлення канчатковай пастановы. Хачу прадставіць найважнейшыя фрагменты рашэння і даць юрыдычную ацэнку тых падзей: ці гэта матыў змагання за незалежную дзяржаву, ці злачынства супраць чалавецтва.

***— Злачынствы супраць мірнага насельніцтва з'яўляюцца злачынствамі супраць чалавецтва. Такая прынамсі сённяшняя дэфініцыя ў абвінавачаннях, якія Гаагскім трыбуналам ставяцца злачынцам з былой Югаславіі.***

— Так, да гэтых злачынстваў адносіцца і генацыд.

***— Заключнай пастановай следства мае быць рашэнне пра спыненне справы?***

— Пракурор, канчаючы следства, састаўляе акт абвінавачання супраць жывой асобы, калі мае доказы яе віны. Калі ж віноўнік быў раней асуджаны або памёр і калі ўчынак не здарыўся, тады пракуратура спыняе следства.

Некаторых фактаў не ўдаецца ўстанавіць. Напрыклад, Юзэф А. кажа, што ягоную маці Надзею забіла траіх. Але хто яны — не ўдаецца ўстанавіць. І ці яны асуджаны, ці жывуць — я не ведаю. І з-за немагчымасці ўстанаўлення тоеснасці віноўнікаў я вымушаны следства ў гэтай справе спыніць. Кіруючы віноўнік, „Буры”, не жыве. Усе паказвалі, што адзін падпольшчык забіваў фурманоў, але ён 16 лютага 1946 года загінуў у сутычцы. У ходзе следства не ўдалося мне ўстанавіць жывых віноўнікаў.

***— Якія юрыдычныя паслядоўнасці будзе мець рашэнне следства для пакрыўджаных? Ці яны могуць разлічваць на кампенсацыю страт?***

— Следства Інстытута нацыянальнай памяці не ставіць мэтай афармлянне кампенсацый; такія пытанні часта мне стаўляюць. Некаторыя асобы дамагаюцца кампенсацый, а я не магу ім сказаць: „Не хадайнічайце, бо іх не атрымаеце”. Хадайніцтва за кампенсацыямі адбываецца ў агульным судзе і тады нашы матэрыялы могуць быць тым судом разгледжаны. Але Інстытут нацыянальнай памяці кампенсацыямі не займаецца.

***— Ці знаёмства з матэрыяламі, якія раней не разглядаліся, уносіць нешта новае?***

— Яны выяўляюць псіхалагічнае стаўленне членаў атрада „Бурага” да праваслаўных, што гэтае насельніцтва супрацоўнічала з Управай бяспекі. Ёсць жахлівыя расказы пра ход падзей, тыпу „я страляў, нікому не дараваў”. Але калі комплексна на гэта глянуць, тады ўзнікае адчуванне, што расказчыкі сталі фантазіраваць, а з гэтага нельга выводзіць юрыдычных высноў. З пункту гледжання закону вартасць такіх паказанняў нязначная, бо няма ўпэўненасці, што так было.

***— Ці былі падставы для рэабілітацыі „Бурага”?***

— Гэта выходзіць за межы майго следства. Спрабую да гэтага аднесціся на заключнай канферэнцыі, каб да таго часу не ўзнімаць буры.

***— Бура і так вісіць...***

— Мяне абвінавачаюць у тым, што я падымаю руку на куміра, героя, знішчаю яго. Дарэчы, кожны выбірае сабе куміра, а я на гэта ўплыву не маю.

***— Ці ў сваёй працы Вы карысталіся матэрыяламі з друку?***




*Рамуальд Райс „Буры” (на сярэднім здымку — другі злева; першы — Казімеж Хмялёўскі „Рэкін”; Беласточчына, 1945 г.)*

— Гэта не рэчавыя доказы, але рабіў я з іх высновы.

***— А як з матэрыяламі друкаванымі ў „Ніве”?***

— Маю некалькі, якія атрымаў у ходзе следства з Галоўнай камісіі з Варшавы.

***— А з сёлетняга студзеня?***

— Не, але ахвотна разгляну. Не скрываю, што не ведаю беларускай мовы, але можа ў каго папрашу дапамогі, хто гэту мову ведае.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі**

**Фота аўтара і http://wilk.wpk.p.lodz.pl/**

# Турыстычныя Кляшчэлі

**Паўднёва-ўсходняя частка Падляшскага ваяводства, якая шчыльна прылягае да мяжы з Беларуссю, бачыцца праз прызму Белавежскай пушчы і іншых прыродных комплексаў. А гэты абшар, якога насельніцтва налічвае 120 тысяч чалавек, адметны таксама і сваім культурным краявідам. Для гэтага абшару ў канцы мінулага года была апрацавана канцэпцыя развіцця турызму.**

У Кляшчэлеўскай гміне няма вялікіх прыродна-ландшафтных каштоўнасцей. Краявід тут мала разнастайны, аблесены сасновым маладняком на неперспектыўных для сельскай прадукцыі ўгоддзях. Адзінай вартай увагі ландшафтнай каштоўнасцю з'яўляецца шырокая лугавая даліна ракі Нурэц. Акрамя гэтага да прыродных каштоўнасцей можна залічыць:

— ахоўваемы ландшафтны абшар „Белавежская пушча" ва ўсходняй частцы гміны,

— прыродны запаведнік „Елянка",

— бабровыя паселішчы ў даліне ракі Нурэц.

Вялікім недахопам з'яўляецца адсутнасць турыстычных маршрутаў і кволая начлежная база. Праз гміну пралягае адзіны веласіпедны шлях на адрэзках Грабавец — Кляшчэлі — Чаромха і Апака-Вялікая — Белая Страж — Войнаўка. У гміне разам 22 начлежныя месцы ў трох агратурыстычных кватэрах у Дабрывадзе і Сухавольцах, а пры вадаёме ў Рэпчычах ёсць палатачнае поле.

Карысная камунікацыйная даступнасць гміны, дзе перасякаюцца шашэйныя трасы Бельск-Падляшскі — Полаўцы і Гайнаўка — Сямятычы ды чыгуначныя лініі з Чаромхі ў Беласток і Гайнаўку.

У лік перспектыўных каштоўнасцей гміны трэба залічыць запаведную гарадскую планіроўку Кляшчэль з некалькімі дзесяткамі маламестачковых драўляных аб'ектаў, комплекс помнікаў сакральнага будаўніцтва — драўляная (ад 1709 года) і мураваная (1870) цэрквы і мураваны касцёл (1910), драўляны будынак кляшчэлеўскага чыгуначнага вакзала (XIX ст.), прасторавыя планіроўкі вёсак з комплексамі драўлянай забудовы (Дабрывада, Палічная, Дашы), драўляная ў Саках (XVIII ст.) і мураваная ў Коснай (1870) цэрквы, драўляныя капліцы ў Дабрывадзе і Сухавольцах ды курган у Грузцы.



Званіца з 1709 г.

Гміннай славутасцю павінны быць таксама шматкультурнасць (у Саках — цудадзейная крыніца ды ўзгорак за царквой, дзе знаходзіцца культавая ікона св. Дзімітрыя), ганчарскія традыцыі (ганчарская зала ў Кляшчэлях), вясковае рукадзелле, разьба па дрэве і традыцыйныя харчовыя прадукты. У лістападзе ў гмінным цэнтры адбываецца агляд вясельных і лірычных песень.

Прадбачваецца шэраг мерапрыемстваў з мэтай прыцягнення вонкавай зацікаўленасці гмінай, у тым ліку:

— перапіс каштоўных аб'ектаў вясковага будаўніцтва дзеля прымеркавання іх для турыстычных мэт;

— разметка турыстычных маршрутаў:

1) пешага і веласіпеднага на адрэзку Апака-Вялікая — Белая Страж — Войнаўка,

2) злучальнага пешага Кляшчэлі — Дабрывада — Палічная — Войнаўка,

3) веласіпеднага па даліне Нурца на адрэзку Чаромха — Дабрывада — Кляшчэлі — Вулька-Выганоўская — Паўлінова — Малочкі;

— уключэнне Палічнай у праграму „Прыгожая вёска";

— аднаўленне запаведнай драўлянай забудовы ў цэнтры Кляшчэль;

— адкрыццё некалькіх чарговых агратурыстычных кватэр у Кляшчэлях, Палічнай і Дабрывадзе;

— занясенне найцікавейшых месцаў у турыстычную прапанову;

— арганізацыя на тэрыторыі гміны цыклічнага фальклорнага мерапрыемства, аснованага на мясцовай рукадзельнай традыцыі (ганчарства, саломапляценне, мясцовыя выпечкі).

**Міхал Мінцэвіч**

---

На рахунку Рамуальда Райса, „Бурага", звыш ста забойстваў, з чаго звыш васьмідзесяці з ліку масавых крывавых лазняў, учыненых над праваслаўным насельніцтвам Залешан, Вулькі-Выганоўскай, Шпакоў і Занёў ды вазакамі каля Пухалаў-Старых у студзені і лютым 1946 года. 28 красавіка 1946 года яго атрад забіў 16 міліцыянераў і убоўцаў. У ліку ахвяр апошніх забойстваў неапазнаныя асобы. Калецтвы і руйнаванне мірных паселішч не падлічваліся.

Суд Варшаўскай вайсковай акругі 15 верасня 1995 года зняў з „Бурага" віну за гэтае дасье. Вось вытрымкі з абгрунтавання гэтай пастановы:

„Walka takiego oddziału (...) siłą rzeczy przybrać miała postać działań terrorystycznych, obiektem których stali się **pojedynczy ludzie bądź też środki materialne niezbędne dla przetrwania** takiej grupy".




„Przecież z drugiej strony czyny te mogły zapobiec lub zapobiegły represjom wobec bliżej nieokreślonej liczby osób prowadzących działalność na rzecz niepodległego bytu Państwa Polskiego, zaś ich skutkiem były w wielu przypadkach śmierć, długoletnie więzienie lub deportacja w głąb byłego ZSRR".

„Można więc bez wątpienia określić sytuacje w jakich znalazły się osoby wyżej wymienione (Райс і Хмялёўскі — А. В.) (...) jako stan wyższej konieczności (...)".

Праваахоўныя органы Рэчы Паспалітай, мабыць таксама „w stanie wyższej konieczności", не заўважылі і не заўважаюць кур'ёзнасці гэтага крутельства, якое звычайны генацыд і злачынствы супраць чалавецтва называе станам вышэйшай неабходнасці.

„Цяжка мне на сэрцы, калі гляджу, як экспануецца дзяржаву як ахвяру, калі чалавечыя ахвяры так шматлікія і ананімныя". (Дубраўка Угрэшыч, харвацкая пісьменніца)

**Аляксандр Вярбіцкі**

### Генацыд

Генацыд абазначае любое з наступных дзеянняў, учыненых з намерам поўнага або частковага знішчэння нейкай нацыянальнай, этнічнай, расавай або рэлігійнай групы:

— забойствы членаў групы,

— прычыненне цяжкіх цялесных або душэўных траўмаў членам групы,

— наўмыснае дыктаванне жыццёвых варункаў, разлічаных на давядзенне групы да поўнага або частковага знішчэння,

— устанаўліванне мер, перашкаджаючых пракрэацыі ўнутры групы,

— насільнае перамяшчанне дзяцей з такой групы ў іншую.

Пакаранню падлягае генацыд, гуртаванне дзеля генацыду, прамое і ўскоснае заахвочванне да ўчынення генацыду, спроба ўдзельніцтва ў генацыдзе і саўдзел у генацыдзе.

### Злачыны супраць чалавецтва

Злачынамі супраць чалавецтва з'яўляюцца наступныя злачынныя дзеянні, учыненыя ў час збройнага змагання, так вонкавага як і ўнутранага характару, скіраваныя супраць любога мірнага насельніцтва:

— забойствы,

— вынішчэнне,

— захоп у рабства,

— дэпартацыя,

— зняволенне,

— мучанне,

— гвалтаванне,

— праследаванне на палітычнай, расавай або рэлігійнай аснове,

— іншыя негуманныя ўчынкі.

# Шпітальная яда

Бельская санэпідэмстанцыя правяла ў 2004 г. 44 праверкі. У параўнанні з ранейшым перыядам сітуацыя паправілася. Калі ў 2003 годзе адмоўную ацэнку атрымалі тры ўстановы, дык у мінулым толькі адна — харчавальны блок бельскага шпіталя, дзе падобная сітуацыя была і ў папярэдніх гадах. У шпіталі няма асобнай пасудамыйні, не хапае таксама прамежкавых стэрылізатараў, што абазначае немагчымасць тэрмічнай дэзінфекцыі пасуды. Харчавальны блок патрабуе капітальнага рамонту і мадэрнізацыі. Летась праведзены там тры кантролі і рэкантролі і вынесена адна адміністрацыйная пастанова.

Як выглядае харчаванне пацыентаў бельскага шпіталя? На аснове праведзенага аналізу дэкаднага супастаўлення прадуктаў за мінулагодні май, выяўлены былі заганы, кранаючыя недахопу прадуктаў змяшчаючых вітаміны $B_2$, A і $B_1$ ды перавышаны адсотак энергіі тлушчавага паходжання. У параўнанні з папярэднім годам харчаванне пацыентаў не змянілася.

У шпітальным меню не хапала б і шмат іншых вітамін, калі б не пладовая дапамога ад земляробаў Бельскага павета. Камісія па ахове здароўя, сацыяльнай дапамозе і сям'і запатрабавала ад дырэкцыі бельскага шпіталя інфармацыі пра колькасць ахвяраваных шпіталю ў 2003 і 2004 гадах раслінных пладоў ды спосабы іх захоўвання і размеркавання.

Як паведаміла дырэктар Бажэна Гратовіч, шпіталю былі падораны: бульба (27 555 кг у 2003 і 49 020 кг у 2004 г.), буракі (адпаведна 1 915 і 2 443), морква (917 і 2 211), пятрушка (100 і 161), цыбуля (128 і 683), сельдэрэй (10 і 10), яблыкі (255 і 0), парэй (10 і 5), капуста (890 і 1 208), фасоля (10 і 0), рэпа (0 і 120).

**(мм)**

# Быць беларусам

Матэрыял Мікалая Капчука п.з. „Пагутарым аб мінулым і будучыні" можна ацаніць на шасцёрку. Гэта ў скарачэнні жывая гісторыя нашага беластоцкага (і не толькі) краю. Намі заўсёды пагарджалі розныя служачыя і накідалі сваё ярмо; ці гэта тыя, што правілі ў Варшаве, ці яшчэ далей. Намі перакідаліся як найгоршым смеццем і дабрадушныя камуністы баяліся нашай гутаркі як агню і заразы, аб чым я шмат пісаў у сваіх допісах. Падумаць толькі: колішні прэм'ер Пётр Ярашэвіч, радавіты беларус, карыстацца роднай мовай ніколі не адважыўся і аднойчы сказаў нейкаму нашаму адданаму чалавеку: „Цяжка сёння быць беларусам". І ведаем, якою смерцю пакінуў гэты чалавек нашу зямліцу, а віноўнікаў ягонага пачварнага забойства і да гэтага часу няма. Што зробіш, калі дурныя кацапы рэвалюцыйнаму кату рускай інтэлігенцыі Феліксу Дзяржынскаму паставілі ўсюды помнікі? Шкада толькі, што не дачакаў ён 1937 года.

**Мікалай Панфілюк**


Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Зорка
для дзяцей і моладзі


Фота Ганны Кандрацюк

Ігар Лукашук са сваімі шасцікласнікамі

# Мама і камп'ютэрныя гульні

Неўзабаве Свята Маці. Вось, як шасцікласнікі з Ягуштова, што непадалёк Бельска, расказалі пра сваіх мам.

**Пятрусь Сідарук:** — Мая мама вельмі шчырая і вясёлая. Яна дапамагае мне рашаць урокі. Калі ў мяне праблемы — тады размаўляем і гэта найлепшае лякарства. Мая мама смачна гатуе. Калі я сумны — яна ўмее развесяліць мяне. На Дзень Маці жадаю ёй многа грошай і задавальнення з сына.

**Агнешка Максімюк:** — Мая мама ціхая, яна не крычыць на мяне і заўсёды мае для мяне час. Я люблю яе. Зычу ёй шчасця.

**Міраслава Грэчан:** — Дарагая мама! Жадаю табе ўсяго найлепшага. Я люблю цябе. Ты заўсёды маеш для мяне час. Дапамагаеш, калі ў мяне праблемы, або калі хварэю.

**Бэата Гурская:** — Любая матуля! Я хачу, каб ты заўсёды ганарылася намі, сваімі дзеткамі. Жадаю табе здароўя.

**Давід Чаламей:** — Мая мама любіць чытаць кніжкі, яна жыццярадасная. Я жадаю ёй самых поспехаў (пасля Давід назваў 17 сваіх любімых камп'ютэрных гульняў). Відаць, ён не ў змозе забыцца пра іх нават тады, калі думае пра маму. Вядома, гульняў, не будзем называць. Аднак падкажам маме, каб не купляла іх ужо Давіду, інакш цалкам ён пра яе забудзецца.

**Караліна Раца:** — Мая мама мілая. Я хачу, каб яна ніколі з-за мяне не хвалявалася.

**Марцін Крупа:** — Маю маму завуць Ірэна. Я жадаю ёй шчасця.

**Патрыцыя Петшыкоўская:** — Мая матуля добрая, слаўная. Яна заўсёды ўмее мяне рассмяшыць. Дапамагае ў цяжкія хвіліны. Я жадаю ёй усяго найлепшага.

**Рафал Х:** — Замест пажаданняў таксама стаў пералічваць камп'ютэрныя гульні. Цікава, чаму яны спалучаюцца яму з мамай. Ці не яна купляе іх сынку?

**Наталля Місюк:** — Я люблю сваю маму. Яна заўсёды мае для мяне час, дапамагае калі трэба. Жадаю ёй усяго найлепшага.

**Гжэсь Цар:** — Калі прынясу дрэнную ацэнку, мама крычыць на мяне. Яна добра гатуе, пячэ смачныя пірагі. Часам лянуецца і нічога не робіць. Але я і так люблю яе. Хачу, каб яна не саромелася за мяне.

**Юстына Ролецкая:** — Мая мама мілая, вясёлая. Я жадаю ёй шчасця.

**Павел Шэшка:** — Я жадаю маме здароўя і поспехаў у працы.

**Моніка Каліноўская:** — Мілая мамачка! Будзь здаровай і шчаслівай. Каб заўсёды ганарылася сваімі дзеткамі.

Зорка

## Мама

*Як сонца мама дакранае,*
*Пяшчотна прыгалубіць, прыласкае,*
*Калі маленькі ты, ці пасівеў таксама,*
*Яна — адзіная, і назаўсёды — мама.*
*Для мамы, звыкла, як усім мамам у свеце,*
*Найпрыгажэйшыя, найдаражэйшы — дзеці,*
*Яна гадуе, корміць, песціць, навучае,*
*Ад ліха, болю, здрады іх абараняе,*
*Гатова за дзіця жыццё сваё аддаць,*
*На грудзі ўласныя усю бяду прыняць.*
*А як аддзячым нашым мамам за апеку?*
*Бывае, так пытаем праз паўвеку,*
*Калі ўжо нашу маму не ўбачым...*
*Тады, як немаўлятка, зноў заплачам,*
*Схавацца схочам у далоні, прытуліцца,*
*Як за мурам, яе спадніцай прытаіцца...*

Міра Лукша

# Беражанка, касатка, варанок

Ластаўка вясковая (касатка), берагавая (беражанка) і гарадская (варанок) і па-латыні інакай называюцца, і выгляд у іх іншы. Пра ластаўку склалі не адну казку, яе імем называлі не адну каханую. Само ж слова ластаўка — такое ласкавае!

**Ластаўка-беражанка** велічынёй з вераб’я, у яе галоўка прыплюшчанай формы на кароткай шыі, вузкія доўгія завостраныя крылы, кароткі, слаба выразаны хвост, шэравата-бурая спіна, белы жывот, поперак грудзей бурая палоска. Лятае хутка, манеўруючы, трымаецца над вадой ці блізка вады вялікімі рассеянымі чародамі — „раяцца” як камары. Большую частку часу праводзіць у паветры, вядзе каланіяльны вобраз жыцця. Гнездзіцца ў норках, якія рые ў нахілах абрываў з мяккай глебай. Паяўляецца ў красавіку ў тым самым месцы. Абедзве птушкі кіпцюрамі рыюць норы 2-3 дні. Гарызантальная нара завяршаецца гняздом з сухой травы з латком з пер’я. На пачатку чэрвеня ластаўка адкладвае 4-6 белых яек, наседжвае іх 12-16 дзён, трохтыднёвыя птушаняты пакідаюць норку. У ліпені птушкі чародамі перасяляюцца ў трасцянікі, у верасні адлятаюць на зімоўку ў Афрыку і Індыю.

**Ластаўка вясковая** — касатка — такой жа велічыні. У яе простыя доўгія і вострыя крылы, глыбока выразаны з доўгімі касіцамі хвост, спіна чорная, ніз светлы, горла ржава-карычневае. Касатка лятае хутка, кідаецца ў розныя бакі. Пры трывозе выдае крык: *тві-віт*. Сваю песню — кароткае шчабятанне з рассыпчатай канцоўкай *ціль* ці *вілі-тррр* часта выконвае, седзячы на правадах. Гнездзіцца ў пабудовах, пад скаламі, у студнях, пад гнёздамі драпежных птушак. Першымі прылятаюць самцы, часта да старога гнязда, блізка яго будуюць новае: лепяць з мокрай зямлі, змочанай слінай, і прынесеных у дзюбе камячкоў, якія ўмацоўваюць конскім воласам і траўкамі, высцілаюць пёрамі. Лётныя птушаняты рассядаюцца на правадах. Бацькі кормяць іх некалькі дзён. За лета касатка выводзіць дзяцей два разы. Касатка наляту ловіць камароў, жукоў, стракоз.

Гарадскі **варанок** мае карацейшы выемчаты хвост, вострыя крылы, чорна-сіняе апярэнне зверху і белае знізу ды на падхвосці. Мае густа апераныя ногі і пальцы. Гняздуецца парамі (і ўсё жыццё ён — манагам) або калоніямі пад 100 пар. Голас абрывісты: *трык-трык* або *чырр-чырр*... Здабычу ластаўкі ловяць выключна ў паветры — камароў, мух, малых жукоў, стракоз, павукоў. Наляту таксама п’юць, чэрпаючы ваду дзюбай.

***Міра Лукша***



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гімназісты з Ягуштова рыхтуюцца да конкурсу „Беларуская песня”

# Брудная сукенка

А вы ведаеце, чаму курачкі начуюць на седале, апусціўшы галоўкі? Тады паслухайце.

На вясновым двары гулялі куры. Шчыпалі траўку, шукалі чарвячкоў. І была сярод іх белая курачка. Да чаго ж цікаўная, жвавая. Усё ёй трэба ведаць, на ўсё паглядзець. Аднойчы не пашанцавала курачцы: загледзелася яна ў лужыну на сваё адлюстраванне, паслізнулася і звалілася ў гразь. Падхапілася курачка, паглядзела на сваю сукенку і спалохалася: якая яна брудная! Пабегла за парадай да сваіх сябровак. Але што гэта? Курачкі адвярнуліся ад яе, нават есці разам не захацелі. А індык-балбатун так з яе смяяўся, стоячы на кладцы, што неспадзявана зваліўся ў канаву. Давялося важнаму гусаку выцягваць яго з вады.

Заплакала курачка. Адышла ўбок, засумавала, не знайшоўшы падтрымкі і спагады. А яна ж лічыла ўсіх сваімі сябрамі. А тут і дожджык пайшоў. Хацела курачка як заўсёды схавацца ад дажджу, але ўспомніла, што нельга ёй бегчы разам з усімі, пабаялася, што зноў будуць з яе смяяцца, і засталася на двары. Прамокла да апошняга пёрка, нават і пасакатаць не змагла. Але затое сукеначка зноў стала бела-белая.

Вечарам, калі ўсе куры паселі на жэрдачку, зайшла небарака нясмела ў хляўчук. Куры, убачыўшы сваю сяброўку, дружна апусцілі галоўкі, баючыся іх падняць, каб не сустрэцца з ёю позіркам. Сорамна ім стала. Вось так і сядзяць яны цяпер. Не верыце? Паглядзіце самі.

***Маша Кляўчэня*, Віцебская вобласць, г. Глыбокае, СШ н-р 2, „Казкі дзяцей Беларусі”**

# Вершы Віктара Шведа

## Чаму малюешся, мама?

*— Чаму ты малюешся, мама? —*
*Было пытанне Адама.*
*— Хачу выглядаць прыгожа,*
*Макіяж у гэтым паможа.*

*Дапытлівы надта сыночак*
*Ад маці даведацца хоча,*
*Калі гэта дзейнічаць будзе*
*Каб маглі захапляцца людзі?*

## Падлей кветкі, доня

*Маці з хаты выходзіць*
*І просіць доню Галю:*
*— Падлей кветкі ў агародзе*
*Каб не засыхалі.*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марта Лапінская з Пухлаў

*Галя раіцца з сястрою,*
*Бо дождж бубніць у вокны.*
*— Парасон вазьмі з сабою,*
*Дык не будзеш мокнуць.*



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гайнаўскія гімназісты выступаюць на 25 Сакавіка

# Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 17: Вуха, маг, збанок, Адам, слон, малыш, рыска, сотка, сойка, клік, краіна. Гном, хор, слой, лыка, кошка, блін, накрыўка, мода, Лі, Ака, клін, макатка.

Узнагароды, фламастэры, выйграді: **Каміла Герасімюк, Паўліна Мялешка** з Дубін, **Анна Порац** з Нарвы, **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага, **Якуб Сухадола, Юстына Смольская, Юстына Навіцкая** з Нараўкі, **Наталля Янцэвія** з Чыжоў, **Барбара Юрчук, Кшысь Грыгарук** з Кленік. Віншуем!



*У другой палове 1980 гадоў Карпюк бярэ актыўны ўдзел у беларускім жыцці Гродна, ягоныя артыкулы хвалявалі грамадскасць...*

# А. Карпюк: Іду пісаць кніжкі

**Некалькі месяцаў у Беларусі не сціхала прапагандысцкая шуміха вакол ветэранаў Другой сусветнай вайны. Але хіба ні разу афіцыёзныя сродкі масавай інфармацыі не згадалі тых беларускіх франтавікоў, што не толькі ваявалі супраць фашызму, але пасля вайны былі беларусамі паводле свайго паклікання і працы. Сярод такіх і Аляксей Карпюк, асоба, якая лучыла Беласточчыну і Гродзеншчыну. А між тым, у красавіку бягучага года споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння пісьменніка. Дата гэтая была ўзгадана толькі ў недзяржаўных беларускіх асяродках.**

Гаворыць Іна Карпюк, удава пісьменніка: „Сёння чамусьці актуалізуюць і сеюць у памяць новых пакаленняў міфы пра Карпюка, якія «фабрыкавалі» ўчарашнія чыноўнікі. Ці міфы, ці зусім нічога чалавечага не ўспамінаюць, нібы Карпюка зусім не было. Нязручным, нявыгадным для чыноўнікаў быў Аляксей Карпюк, наіўны праўдалюбец. Меў свае погляды, сваю стратэгію паводзін, свае інтэрпрэтацыі ў ацэнцы падзей".

Нарадзіўся Аляксей Карпюк 14 красавіка 1920 г. у вёсцы Страшава, што паблізу Гарадка. Паходзіў ён з сялянскай сям'і, бацька быў сябрам КПЗБ. У 1934 годзе скончыў сямігодку, далей навучаўся ў польскай гімназіі ў Вільні. У 1939 г. гімназію зачынілі, Аляксею давялося ехаць у Навагрудскую педагагічную вучэльню. Калі пачалася нямецка-савецкая вайна, Карпюк падаўся ў партызаны. У снежні 1942 г. ён трапіў у нямецкі палон, далей яго чакаў фашыстоўскі канцлагер Штутгаф. Пазней гэты факт біяграфіі неаднаразова адгукнецца ў жыцці Карпюка. З канцлагера ў 1943 г. Аляксею цудам удалося ўцячы.

Іна Карпюк: „Аляксей усё жыццё памятаў, што ў Штутгафе ён быў нумарам 22 584... Так, яму пашанцавала, ён збег з гэтага пекла. Дапамог пасля ўцёкаў яму англічанін, палонны, які працаваў у нямецкага баўэра, у стадолу якога трапіў Аляксей ноччу: даў паесці, даў адзежу і трохі грошай на цягнік".

Вярнуўшыся дамоў, Карпюк разам з маці і бацькам зноў пайшоў у партызаны, неўзабаве сарганізаваўшы з моладзі атрад імя Кастуся Каліноўскага. Пра тое, як ваяваў гэты атрад можна знайсці звесткі ў дакументальным альбоме „Зямля беластоцкая прыпамінае". У жніўні 1944 г. Карпюк быў ужо ў рэгулярных войсках Чырвонай Арміі, дайшоў з баямі да Берліна. У адной з бітваў за Рэйхстаг атрымаў цяжкае раненне, перанёс чатыры аперацыі і хоць страціў адно лёгкае, застаўся жыць.

Пасля вайны Карпюк паступіў на вучобу ў Гродзенскі педагагічны інстытут на аддзяленне англійскай мовы, якое скончыў у 1949 г. Нейкі час працаваў загадчыкам аддзела адукацыі ў Сапоцкіне, пазней дырэктарам сямігадовай школы ў вёсцы Біскупцы Ваўкавыскага раёна. Далей была журналісцкая праца ў Гродне. Вакол Карпюка ў 1960-х гадах у горадзе над Нёманам паўстаў нефармальны асяродак інтэлігенцыі, у якім выразна вылучаліся яшчэ дзве асобы — Васіль Быкаў (ён тады працаваў у „Гродненской правде") і таленавіты гісторык Барыс Клейн (у апошняга аўтару гэтых радкоў пашчасціла навучацца).



*Фота з архіва жонкі Аляксея Карпюка — Іны*

Барыс Клейн, які цяпер жыве ў ЗША, нядаўна надрукаваў свае ўспаміны пра гродзенскую тройцу. Вось што ён піша: „Атмасфера, што ўсталёўвалася ў нашай «групе», не была атручаная ўзаемным недаверам. Але і ідылічнай не была таксама. Мы супастаўлялі нашы ацэнкі навакольнай рэчаіснасці, падзеяў мінулага, літаратурных густаў... Гэта падтрымлівала высокі тонус духоўнага жыцця, абсалютна несумяшчальны з тыповым афіцыёзам". У эпіцэнтры сяброўскай групы быў Карпюк, які распаўсюджваў нелегальную літаратуру, ліставаўся з вядомым расійскім дысідэнтам Салжаніцыным.

**У чэрвені 1969 года старшыня КДБ СССР Юрый Андропаў накіраваў у ЦК КПСС дакладны ліст, які датычыў гродзенцаў-„крамольнікаў". Вось вытрымкі з яго: „Комитет государственной безопасности Белоруссии располагает данными о политически нездоровых настроениях белорусских писателей Карпюка и Быкова... Карпюк нелегально распространяет среди своих знакомых различные пасквили... Взгляды Карпюка в определённой степени разделяет Быков, автор тенденциозной повести „Мёртвым не баліць"... КГБ Белоруссии с санкции ЦК Компартии республики готовятся мероприятия, направленные на разоблачение возможных враждебных акций со стороны названных лиц".**

Пятрусь Макаль, яшчэ адзін выхадзец з Беласточчыны, напісаў нейк верш „Гродзенская патэльня" наступнага зместу:

*Тут штодзень дыміць азотнатукавы,*
*Копаць індустрыі несучы,*
*Тут штодзённа Быкава застукваlі*
*Абласнога ранга стукачы...*
*Тут за праўду на агонь пякельны,*
*Быццам трапяткога шчупака,*
*Цягнуць на гарачую патэльню,*
*Смажаць Аляксея Карпюка.*

Зразумела, што верш гэты не мог быць надрукаваны ў той час, яго Макаль проста падарыў на паперцы жонцы Карпюка. Вакол Карпюка ўвесь час гуртаваліся маладыя творцы. З успамінаў Дануты Бічэль-Загнетавай: „Яго не прасілі. Ён сам праяўляў ініцыятыву, апекаваўся, браў нашы вершы, перадрукоўваў, вазіў у сталіцу, выбіваў для нас запрашэнні на з'езды, хадзіў да начальства, каб уладкаваць нас. Арганізоўваў сходы, сустрэчы, паездкі... Нам, каго ён цягнуў за вушы, каб падраслі і займалі годнае месца ў літаратуры, Карпюк застаўся ў памяці Дон Кіхотам, які шэрае жыццё імкнуўся ператварыць у незабыўную цікавую прыгоду".

У 1972 годзе Карпюк быў выключаны з КПСС паводле абвінавачання ў нацыяналізме і кулацкім паходжанні. Да ўсяго яму „прышылі" хлусню пра тое, што Карпюк насамрэч не ваяваў і нават супрацоўнічаў з фашыстамі падчас знаходжання ў канцлагеры.

Барыс Клейн піша: „Карпюка ў любы момант маглі арыштаваць. Аднойчы Быкаў нават паверыў у безвыходнасць і канстатаваў наступнае: «Сядзеў ты ў польскай турме, нямецкай, цяпер упякуць цябе і ў нашу. Абклалі з усіх бакоў». Васіль нават дагаворваўся з расійскімі сябрамі-пісьменнікамі, каб схаваць Карпюка на некаторы час у псіхбальніцу — каб хоць так, праз знаёмых дактароў, здабыць сябру «ахоўную грамату». На гэта Карпюк не пайшоў".

Ужо пазней стала вядома, што лагерныя дакументы былі сфальшаваныя супрацоўнікамі КГБ Фаміным і Клімовічам. Цягам трох гадоў Карпюк не мог нікуды ўладкавацца на працу. Урэшце ўдалося прабіцца да першага сакратара ЦК Кампартыі БССР Пятра Машэрава. Той доўга разбіраўся, але ўрэшце дапамог.

Іна Карпюк кажа: „Усё жыццё разважаю, што гэта было: маральныя матывы? Акт хрысціянскага сумлення, пакаяння? Ці прадчуванне сацыяльнай катастрофы, спознене гістарычна, але ж выяўленае імкненне да кампрамісу з часткай творчай інтэлігенцыі?" **Трэба адзначыць, што сябры і калегі не пакінулі Карпюка ў бядзе. Пасля выключэння з партыі, Максім Танк не даў выключыць яго з Саюза пісьменнікаў. Кажуць, што разам з Янкам Брылём, ён хадзіў па гэтаму пытанню ў ЦК. Не застаўся ў баку і Васіль Быкаў (у свой час Карпюк таксама бараніў сябра).**

**Іна Карпюк: „Трэба сказаць, што Васіль, яго Надзея Андрэеўна, потым Ірына Міхайлаўна пазычалі грошы, каб не загінулі нашы дзеці, гаварылі чалавечыя словы. За гэтую падтрымку ў паўсядзённасці, за тое, што рабілі гэта тактоўна, нават мякка („Аддасце, калі зможаце!". Аддалі... Таму што ацалелі) я і сёння ўдзячна гэтым людзям".**

Адна з самых цікавых старонак жыцця Карпюка звязана з Беларускім музеем гісторыі рэлігіі, які значны час размяшчаўся ў колішнім Гродзенскім манастыры Раства Багародзіцы. Карпюк быў першым дырэктарам музея (у 1977-1981 гадах). Гаворыць Ніна Ляшчонак, галоўная захавальніца сховішчаў музея: „Ён быў вельмі далікатным чалавекам, ніколі не падвышаў на нас голас, не патрабаваў тэрміновых вынікаў, разумеючы асаблівасці музейнай справы. Яго мяккая патрабавальнасць была нейкага асаблівага кшталту. Карпюк заразіў нас ідэяй збіральніцтва экспанатаў, экспедыцыі былі сама цікавай часткай нашай працы, прытым Карпюк вельмі клапаціўся за нас, як за дзяцей, апекаваўся намі. Ён навучыў нас не баяцца чыноўнікаў і міністраў, дзякуючы яго кіраванню, мы былі самастойнымі і незалежнымі. У яго заўсёды было мала часу, можа таму ён быў такім хуткім і порсткім, не любіў, калі яго адцягвалі ад працы. Але ў вачах заўсёды была глыбокая задуменнасць. Калі Карпюк звальняўся з музею, сабраў нас і сказаў: „Я іду пісаць кніжкі".

У другой палове васьмідзесятых гадоў ужо мінулага стагоддзя Карпюк бярэ актыўны ўдзел у беларускім грамадскім жыцці Гродна, ягоныя вострыя публіцыстычныя артыкулы хвалявалі грамадскасць. Бюро Гродзенскага абласнога камітэта нават прыняло адмысловую пастанову, у якой гаварылася: „Карпюком субъективно, односторонне показана освободительная миссия Красной Армии в сентябре 1939 года, по-своему трактуется отношение жителей к воинам и ход коллективизации в 40-50-е годы". Неўзабаве ў камуністычным ідэалагічным рупары — часопісе „Политический собеседник" выходзіць брудны пасквіль. Карпюк падае на часопіс у суд і ў красавіку 1991 года выйграе працэс (па сённяшніх часах цяжка паверыць, што ў Беларусі была такая адліга, што можна было дабіцца праўды праз суд!). Праз тры дні пасля справядлівага выраку Карпюк выходзіць з КПСС. Не стала пісьменніка 14 ліпеня 1992 года. Праз колькі месяцаў у Мінску памёр Міхась Ткачоў. Горад над Нёманам, страціўшы гэтых духоўных волатаў, нібы асірацеў. Пасля смерці Аляксея Карпюка гродзенскі кампазітар і паэт Яўген Петрашэвіч напісаў песню, якая канчаецца так:

*Будзе вецер абдымаць і песціць*
*Белу Русь, матулю, у вяках.*
*Ёсць у Гродне ласкавая песня,*
*Толькі не хапае Карпюка.*

**Уладзімір Хільмановіч**

# Гарадское мінулае Орлі

Орлі сёння каля пяціста гадоў, з ліку якіх каля трохсот была яна горадам. Першыя весткі пра Орлю датуюцца пачаткам XVI стагоддзя. У 1507 годзе Орля была прысвоена Яну Іванавічу, а пасля шляхам сямейных парадненняў апынался ў руках м.інш. Багавітыновічаў, Тэнчынскіх, Алелькавічаў, Радзівілаў, Браніцкіх, Вітгенштэйнаў. Найбольшы росквіт прайшла Орля пад панаваннем Радзівілаў.

## Прывілея для Орлі

У 1618 годзе Кшыштаф Радзівіл, пазнейшы віленскі ваявода і вялікі гетман літоўскі, прысвоіў Орлі гарадскую прывілею. Мяшчане атрымалі права выбіраць войта, шасцярых засядацеляў і пісара. Устаноўлены былі штотыднёвыя кірмашы ў рынку і гадавы кірмаш у дзень праваслаўнага свята Сімана і Юды. Мяшчане былі на дзесяць гадоў звольнены ад падаткаў за пляцы, агароды, палі і карчмы, але князь Радзівіл загадаў ім за свой кошт узвесці ў рынку ратушу; князь абяцаў прысвоіць гораду магдэбургскае права.

## Арлянскі палац

Орля стала выдатным транзітным пунктам між Літвою і Каронай, таму Радзівілы ўзвялі тут абведзены бярвеннем палац з камянёў і цэглы з чатырма вежамі і купалам. Паўстаў там абшырны комплекс дваровых і фальварчных збудаванняў, абведзены ставамі, садамі і італьянскім паркам.

Арлянскі палац быў несумненна вялікім збудаваннем, пра што сведчыць таўшчыня яго муроў ад паўтара да двух метраў. Пышны інтэр'ер складалі рэнесансная мэбля, упрыгожаныя кафельныя печы, галерэя партрэтаў сям'і Радзівілаў. Побач палаца раслі ліпы, а час паказваў сонечны гадзіннік. Крыху далей былі сад, лазня, дом садавода, два ставы. За агароджай, з другога боку вуліцы Дворскай, распасціраўся фальварак і гаспадарчыя збудаванні, далей — піваварня і італьянскі парк, а на рацэ працаваў вадзяны млын. Патрэбы двара забяспечвалі таксама фальваркі ў Міклашах і Пашкоўшчыне ды далейшых пяць млыноў.



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Царква св.св. Кірылы і Мяфодзія на арлянскіх могілках

## Узлёты і падзенні

У пачатку XVII ст. Орля мела свой уласны карабель, прычалены ў Мельніку, які служыў для гандлю збожжам. У 1622 годзе, паралельна з будовай палаца, князь Радзівіл узвёў кальвінскі касцёл. У пачатку 30-х гадоў XVII ст. Орлю датла знішчыў пажар. Жыхары хутка адбудавалі сваё мястэчка і ў 1635 годзе ў Орлі былі ўжо 143 дамы, у якіх пражывала дзевяцьсот асоб. Аднак каля 200 пляцоў не былі яшчэ забудаваны. У 1643 годзе князь Януш Радзівіл аднавіў гарадскую прывілею, бо ранейшая згарэла ў час пажару. Тэрмін кірмашу пераносіўся з серады на нядзелю пасля кальвінскага набажэнства. Тады Орля атрымала герб: чорны арол у чырвоным полі з княжацкай мітрай на галаве і з тапаром у правай назе.

На працягу ўсяго XVII ст. Орля была важным цэнтрам пратэстантызму. У 1644 годзе адбыўся тут пад старшынствам Януша Радзівіла генеральны кальвінскі сінод, на які з'ехаліся дэлегаты ад усёй Рэчы Паспалітай; да 1655 года ў Орлі адбылося некалькі сінодаў, на якіх абмяркоўвалася тактыка дысідэнтаў на час сеймавых пасяджэнняў.

У 1654 годзе ў Орлі была уніяцкая царква, кальвінскі і рымска-каталіцкі касцёлы ды яўрэйская бажніца. Годам пазней у мястэчку быў 261 дом, а ў цэлай воласці 792. Падзеі наступных дзесяцігоддзяў, войны і наезды, давялі Орлю да ўпадку. У час шведскага „патопу" Радзівілы сталі на бок шведскага караля і частка яго кальвінскіх прыхільнікаў загінула, а іншыя былі пасля прымушаны прыняць каталіцызм. Пацярпеў і палац, і хаця яго аднавілі, чарговыя страты ў 1705-1708 гг. нанеслі наезды літоўскага падканцлера Станіслава Шчукі.

Пасля ваенных знішчэнняў і эпідэмій наступіў перыяд стагнацыі. У 1775 годзе ў Орлі асталося толькі 90 дамоў, у якіх пражывала каля паўтысячы асоб, у тым ліку звыш ста яўрэяў; яны ў 1754 годзе выкупілі кальвінскі касцёл з прызначэннем яго на сінагогу.

У 1867 годзе Орля налічвала ўжо 1 375 жыхароў, працавала ў ёй сем прамысловых майстэрняў. У канцы XIX ст. уладальнік Орлі князь Вітгенштэйн перадае зямлю ва ўласнасць аселым на ёй земляробам. Тады мястэчка патраціла і гарадское права.

У 60-х гадах XIX стагоддзя ў многіх праваслаўных прыходах наступіў уздым царкоўнага будаўніцтва. У 1867-1870 гг. за сродкі арлянскіх прыхаджан на тамашніх могілках была пабудавана драўляная царква на каменным фундаменце. У яе пасвячэнні прымала ўдзел васьмярых святароў і дваіх дыяканаў. Апекунамі арлянскай могільнікавай царквы святыя Кірыла і Мяфодзій сталі невыпадкова. У часе пабудовы царквы шырока адзначалася тысячагоддзе асветніцка-місіянерскай дзейнасці славянскіх вучыцеляў.

Драўляная царква моцна паднішчэла ў 1915-1921 гг., калі прыхаджане знаходзіліся ў бежанстве. І пасля іх вяртання з-за цяжкіх матэрыяльных абставін вернікаў не праводзіліся ў ёй ніякія рамонты. Толькі дзякуючы намаганням сённяшняга арлянскага настаяцеля а. мітрата Аляксандра Такарэўскага царква была адрамантавана, а могілкі — добраўпарадкаваны.

У народзе ходзяць чуткі, што перад ад'ездам у бежанства ў 1915 годзе прыхаджане закапалі каштоўны звон побач царквы, аднак пазнейшыя яго пошукі не далі станоўчага выніку. Доўгі час заміж звана выкарыстоўвалася чыгуначная рэйка, на месца якой толькі дзесяць гадоў таму назад быў павешаны малы звон са Свята-Міхайлаўскай царквы.

З часу пабудовы могільнікавай царквы св.св. Кірылы і Мяфодзія дзень 24 мая (паводле новага стылю) стаўся штогадовым прыхадскім святам. Хаця тры дні раней, 21 мая, Свята-Міхайлаўская царква ў Орлі адзначае прыхадское свята Іаана Багаслова (у другі раз 9 кастрычніка).

## Сённяшнія сляды

Ад палаца Радзівілаў у Орлі асталося шмат слядоў. У зямлі відаць яшчэ добра захаваныя фрагменты каменных падмуркаў ды кавалкі пабітай цэглы, фарфору, шкла, манеты XVII і пазнейшых стагоддзяў. Калі я некалькі гадоў таму распытваў арлянскіх старажылаў, яны прыгадалі звыш трыстагадовую ліпу. Сённяшнія насельнікі паслязамкавага месца стаўлялі свае дамы на захаваных фрагментах палацавых фундаментаў. Вада з дамашняй каналізацыі сцякае там вельмі хутка, мабыць у палацавыя падвалы. У даліне Арлянкі ёсць выразнае месца ад штучнага става — з рэшткамі дубовага дна — які, як апавядалі старажылы, працаваў для тамашняй піваварні.

**Міхал Мінцэвіч**

# У Сібір

***Успаміны Сцяпана ДАРАШКЕВІЧА, народжанага ў 1919 годзе ў Цісах, дваюраднага брата пакойнага мітрапаліта Васілія.***

*У 1941 годзе вывезлі нашу сям'ю ў Сібір, прызнаючы кулакамі, бо ў нас было многа зямлі. На досвітку, у Зялёныя Свёнткі, прыехалі на фурманках, паведамляючы, што перасяляюць нас „в другое место жительства". Забралі тых, што былі ў хаце: бацькоў, брата з паламанай нагой, брацiху, іх трохмесячную дачушку і мяне. Асталіся толькі адсутныя дома браты, з якіх адзін быў у Беластоку бацюшкам, а другі працаваў на аэрадроме ў Бельску; апошні, калі даведаўся пра нашу вывазку, вярнуўся дахаты, але пакуль гэта сталася, суседзі паспелі ўжо ўсё з хаты расцягнуць — сусед павесіў у сябе наш гадзіннік і нам яго не аддаў.*

*Завезлі нас на станцыю ў Жэдню, а там ужо было многа ссыльных з навакольных вёсак. Ехалі мы поездам мо каля месяца. Нашых таварышаў па ссыльцы высадзілі раней, а нашу сям'ю завезлі аж у Усць-Ішымскі раён Омскай вобласці; Урал помню да сёння.*

*Апынуліся мы ў калгасе. Там прыходзілі спецыялісты і падбіралі патрэбных ім работнікаў. Хто са зняволеных нічога не ўмеў, таго бралі на высечку ў тайгу. Мяне прызначылі бондарам і я на працякаючыя бочкі з грыбамі набіваў абручы. Брат са зламанай нагой у гіпсе каля года хадзіў на кастылях, а ягоная жонка бульбу сушыла. Бацька быў печніком і я пры ім навучыўся гэтай прафесіі. Заходзіў я ў пякарню, дзе было чатыры печы. Загадчыцай пякарні была Сонечка з Украіны, мы добра пазнаёміліся і яна часам крыху больш хлеба дадавала, чым прапісанага ад на буханка на ўсю нашу сям'ю. Суп мы варылі з сухой бульбы, што братавая прыносіла дахаты. Вечарамі выходзілі на Іртыш, калі рыба падходзіла да берага шукаючы жору і мы яе невялікай сеткаю, „намёткаю", лавілі; але тая рыба посная была. Аднойчы ў калгасе конь зламаў нагу, то яго зарэзалі і мяса маланкава расцягнулі. Пакуль старшыня калгаса з'явіўся, то ўжо яму нічога не засталося. А сёння хто ў нас конскае еў бы?*



Франтавы здымак Сцяпана Дарашкевіча (справа)

*Не помню, як я даведаўся пра фармаванне польскага войска, але падаўся з братам у Сельцы-на-Ацэ, бо гэта была адзіная магчымасць вырвацца з Сібіры. Калі пыталі, рускі я ці польскі, я адказваў:*

*— Я з Польшчы і хачу ў Польшчу!*

*Служыў я ў артылерыі, у гаўбіцах 122 мм. Біўся пад Леніна, раненняў не атрымаў, так як і брат. Браў варшаўскую Прагу. Там усё мёртвае было, ніхто нічога не рабіў. Мы печкі стаўлялі ў падвале і так начавалі. Пасля наша часць была падпарадкавана маршалу Ракасоўскаму. Дайшлі ў Германію. На калёніі немец стаіць і кажа:*

*— Гітлер капут!*

*— Гітлер капут і вайна капут! — адказаў я яму.*

*— O, gut, gut!*

*Пасля вайны вярнуўся я дадому, і брат вярнуўся. Вярнуліся і бацькі з братавай і пляменніцай. А ніякіх дакументаў саветы пра вывазку не далі — забралі нас, як чорт прэсную душу.*

***Запісаў Аляксандр Вярбіцкі***

*Сайт нездарма носіць назву „Радзіма майго духу". У ім распавядаецца пра найцікавейшыя мясціны, якія непарыўна звязаныя з беларускім народам...*

# www.radzima.org

Цёплая пара года натхняе на вандроўкі. Для многіх людзей яны асацыююцца з паездкамі ў далёкія заморскія краіны, дзе само толькі ўласнае знаходжанне ўжо ёсць чымсьці незвычайным. Але незвычайнае можна ўбачыць і не ад'язджаючы за трыдзевяць зямель. На добрыя экскурсіі па родным беларускім краі натхняе неблагі сайт у Інтэрнэце, што месціцца па адрасе http://www.radzima.org.

Сайт нездарма носіць назву „Радзіма майго духу". У ім распавядаецца пра найцікавейшыя мясціны, якія непарыўна звязаныя з беларускім народам. Прычым незалежна ад таго, у якой краіне гэтыя мясціны сёння знаходзяцца і якой дзяржаве належаць. Межы можна правесці па зямлі, але не па нацыянальным духу.

Уласна сайт створаны па аналогіі з іншымі сайтамі на краязнаўча-турыстычную тэматыку. Уверсе на фоне пахмурнага неба паўтараецца ягоная назва. Побач з ёй распрацоўшчыкі дадалі выяву крыжа з распятым Хрыстом, на шыі якога вісіць беларускі вышываны ручнік. У нечым гэтая выява ёсць своеасаблівым сімвалам сайта — відаць, ягоныя натхняльнікі лічаць, што Беларусь падобная на распятага Сына Божага. Магчыма, яны маюць рацыю.

Пад назвай знаходзяцца выйсці да некаторых рубрык. Таму з галоўнай старонкі, дзе мы апынаемся адразу пасля выйсця на гэты сайт, перамясцімся на старонку, якая называецца „Аб праекце". Такая акалічнасць дасць нам магчымасць даведацца, хто і дзеля чаго зрабіў даную вэбстаронку. Як пішуць стваральнікі, а ўсяго іх трое, „дадзены праект рэалізуе магчымасьць цэнтралізацыі, сістэматызацыі і своечасовага абнаўленьня краязнаўчай інфармацыі і ўяўляе сабой даведнік, а ў далейшым і энцыклапедыю краязнаўчых ведаў. На сайце багата арыгінальнага фотаматэрыялу, можна таксама знайсьці цікавыя гістарычныя зьвесткі непасрэдна пра рэгіёны і месцы Беларусі. Акрамя таго, што гэта энцыклапедычны даведнік, сайт зьяўляецца і даведнікам турыстычным". Тут таксама месцяцца і планы развіцця „Радзімы майго духу" ў этнаграфічных накірунках рассялення беларусаў.

Прысутнічае тут і такая рубрыка як „Шпалеры". Але да нейкіх гандлёва-будаўнічых прац яна не мае ніякага дачынення. Папросту жадаючыя, якім спадабаўся той ці іншы беларускі краявід, могуць „перапампаваць" сабе яго выяўленне з данага сайта, а потым пры магчымасці раздрукаваць у патрэбных памерах. Адразу адзначу, што выбар „шпалераў" вельмі багаты.

Ну а цяпер вернемся на галоўную старонку. Яна падзяляецца на традыцыйныя тры часткі. Найвялікшая — пасярэдзіне. У ёй якраз тое, дзеля чаго і быў створаны сайт — расповеды пра розныя гістарычныя мясціны і фотаздымкі да іх. Таксама тут пададзеныя невялікія падрубрыкі з апошнімі, відаць, абнаўленнямі: „Артыкулы", „Страчаная спадчына", „Шпалеры тыдня", „Новыя кнігі" і гэтак далей.

У левым баку выйсці на старонкі, якія абазначаныя як „Вобласці". У іх усе беларускія найбуйнейшыя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі, а таксама Смаленская і Бранская вобласці Расіі. Выходзячы з плана дзеяннаў па развіцці інфармацыйнай насычанасці сайта трэба чакаць з'яўлення там Падляшскага ваяводства і віленскага абшару. Таксама на гэтым баку старонкі можна пазнаёміцца з турыстычнымі маршрутамі, якія нам прапануюць распрацоўшчыкі сайта.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Адолець Чэхію апрыёры было нерэальна, таму для выхаду ў чвэрцьфінал беларускім хакеістам патрэбна было перамагаць Казахстан і Швейцарыю...*

# Беларусь, беларусы...

### З надзеяй на заўтра

Чэмпіянат свету па хакеі завяршыўся для беларускай дружыны з добрым вынікам. Дзесятае месца ў эліце — гэта пэўны поспех. Вышэй на першынствах планеты мы былі толькі аднойчы — у 1998 годзе, калі размясціліся на восьмай пазіцыі.

У пачатковым групавым турніры беларусы ўзялі, як кажуць, сваё. Дзве прыстойныя паразы ад мацнейшых Славаччыны (1:2) і Расіі (0:2) і ўпэўненая перамога над гаспадарамі пляцоўкі — аўстрыйцамі (5:0) без асаблівых праблем дазволілі выйсці падначаленым Глена Хэнлана ў наступны раўнд. Зазначым, што Аўстрыя і надалей выявіла сябе аўтсайдарам, у выніку заняла апошняе 16-е месца і на пару з Нямеччынай пакінула мацнейшы дывізіён. На другім этапе заданне для нашых выглядала знешне проста. Адолець Чэхію апрыёры было нерэальна, таму для выхаду ў чвэрцьфінал патрэбна было перамагаць Казахстан і Швейцарыю. Адолець казахаў (у іх складзе спрэс хакеісты са славянскімі прозвішчамі) удалося з вялікай цяжкасцю (2:0), дастаткова удакладніць, што другая шайба была закінута на апошніх секундах матча ў пустую брамку. Са швейцарцамі гульня мела люстраны характар (0:2). Цяпер ужо нашы, якія мелі мінімум рэальных шанцаў забіць гол, былі змушаны напрыканцы здымаць галкіпера. Марна і ў чвэрцьфінал заслужана выйшла Швейцарыя. У апошняй гульні з Чэхіяй, якая для нас амаль нічога не вырашала, беларусы саступілі (1:5). Усё ж розніца ў класе значная.

Аналізуючы выступ беларускіх хакеістаў, можна сказаць, што каманда згуляла ў сваю сілу. Бліскуча выявіў сябе брамнік Андрэй Мезін, які стаў лепшым сярод усіх галкіпераў. Наш абаронец апошняга рубяжа ў 5 гульнях прапусціў толькі 5 шайбаў (адбіў 165 кідкоў са 170), у Мезіна самы высокі працэнтны паказчык па сэйвах (адведзеных пагрозах). У атацы вызначылася першае звяно (Кальцоў — Грабоўскі — Цыплакоў). Гэтая тройка сапраўды грала, іншыя ж паводле задання Хэнлана „цягалі піяніна". Міхаіл Грабоўскі закінуў у брамку аўстрыйцаў ажно чатыры шайбы (!). Тут можна прыгадаць і ягоны лютаўскі хет-трык у сумнапомным матчы з Латвіяй. Ужо падчас турніру стала вядома, што лепшы наш цэнтрфорвард падпісаў кантракт з чэмпіёнам Расіі маскоўскім „Дынама" (яго трэніруе колішні настаўнік беларускай дружыны, цяперашні расійскай, Уладзімір Крыкуноў). А лепшым бамбардырам беларускай дружыны на гэтым турніры стаў Канстанцін Кальцоў — 6 пунктаў (3 галы і 3 перадачы). А яшчэ беларуская каманда ўсталявала рэдкае дасягненне для топ-турніру — аніводнага разу не прапусціла, гуляючы ў меншасці. Азмрочыўся чэмпіянат дыскваліфікацыяй беларускага абаронца Цімоха Філіна. Пасля першай гульні са Славаччынай у яго арганізме былі выяўлены допінгавыя рэчывы. За апошнія пяць гадоў гэта першы выпадак на чэмпіянатах свету. Але не апошні, бо праз дзень „папаўся" украінец Пабеданосцаў, які ў мінулым сезоне таксама выступаў за беларускі клуб — магілёўскае „Хімвалакно". Цяпер абодва хакеісты будуць дыскваліфікаваны на два гады без права ўдзелу ў кожных афіцыйных турнірах, трывожыць і сам факт ужывання допінгу гульцамі беларускіх каманд.

Галоўная выснова — беларуская дружына ідзе шляхам змены пакаленняў і мае шанцы на наступным чэмпіянаце свету, які пройдзе ў Латвіі, выступіць, прынамсі, не слабей.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

### Майстэрства хабару

*— Нам, кантрабандыстам, грэх скардзіцца на лёс, — пераехаўшы мяжу заявіў свайму калегу загарэлы парушальнік мытнага права з дзесяцігадовым стажам гэтай небяспечнай прафесіі. — Тым хто нас правярае, стала жыць яшчэ больш невыносна, чым нам. Мне іх часам бывае нават шкада. Нарабілі зараз усялякіх спецслужбаў, якія цікуюць за супрацоўнікамі мытні як воўк за авечкамі. Яны цяпер як сапёры — могуць памыліцца толькі адзін раз. Жывуць на адну зарплату. Хабар браць баяцца. Жах.*

*— Як ёсць галава, то сам чорт табе не брат. Заўсёды можна штосьці прыдумаць, — не пагадзіўся непаголены сонны калега. — Галоўнае трошкі мазгамі варочаць. Памятаеш Толіка Загорскага?*

*— Вылога кантрабандыста, які ўладкаваўся ў міліцыю, што пасецца на дарозе Гродна — Беласток як цялушка ў лубіне? Памятаю. Нешта чуў, што яго праваахоўныя органы цягалі за хабар.*

*— Ну дык слухай. Стукнула неяк Толіку ў башку, што займацца нелегальшчынай для яго занадта клопатна. Саскочыў ён з кантрабанды і нейкім чынам уладкаваўся ў міліцыю. І дамогся, каб яго пры мяжы паставілі. Як кажуць, пусцілі казла ў агарод. Ён жа ўсе сакрэты кантрабандыстаў ведае. Сам такі быў. Ну, і пачаў душыць былых калегаў. Праверяе машыны, здзекуецца. Зусім азвярэў, жывёла. Хабар браў не саромеючыся. Не вытрымалі хлопцы такой абразы, данеслі на гэтую паскуду спецслужбам. Маўляў, убіўся як карова ў бульбу і толькі кішэні сабе набівае. Ніякога сораму.*

*Ну, а кадэбэшнікам толькі гэта і трэба. Паслухалі яны, што могуць узяць хабарніка без напругі, як кажуць „голымі рукамі", ды і задумалі спецаперацыю па выяўленню несумленнага міліцыянта. Узялі машыну на расійскіх нумарах, бо ведалі, што Загорскі найбольш прыкалупваўся да расіян, наклалі не хаваючы тавару і давай парушаць на дарозе ўсё, што можна парушыць.*

*Спыніў іх Загорскі, праверыў дакументы:*

*— Рыхтуйце маскалі грошы. Вы столькі зараз напарушалі, што штрафы будуць большыя, чым машына з усім вашым таварам каштуе.*

*— Можа як дамовімся, — пачаў прыдурвацца кіраўнік спецаперацыі. — Мы не скупыя. І бабла ў нас хопіць, каб купіць усю гродзенскую міліцыю.*

*— Я заўсёды гатовы пайсці людзям насустрач, — не саромеючыся пагаджаецца міліцыянт. — Толькі хабару я не бяру. Хадземце лепш у буфет. Нальеце мне шклянку добрага каньяку, бо галава баліць, на гэтым і разыдземся.*

*У буфеце Толік паказаў пальцам на самы дарагі каньяк, які сабе нават Ракфелер піць не дазваляе. „Парушальнікі" плацілі, а буфетчыца толькі паспявала наліваць. Як Загорскі выжлуктаў другую бутэльку, кадэбэшнікі дастаюць пасведчанні і тыкаюць імі Толіку ў нос:*

*— Ну што, казёл, папаўся. Цяпер за хабарніцтва прыйдзецца пыхцець.*

*— Пра які хабар размова? — здзіўлена пытаецца Толік.*

*— Каньяк піў?*

*— Не.*

*— Як не. Буфетчыца бачыла.*

*— Нічога я не бачыла, — закрычала буфетчыца, паказаўшы свае гнілыя зубы, ад чаго і супрацоўнікі спецслужбаў, і нават Загорскі з агідай адвярнуліся.*

*— Ага! — Узрадаваўся кіраўнік спецаперацыі. — Ды мы ў дадатак да хабарніцтва раскрылі яшчэ і змову. Дзіраўце хлопцы пагоны для новых зорачак! А Загорскага на экспертызу. Там скажуць, піў ён ці не.*

*Пасля таго як доктар, праверыўшы кроў, мачу і сліну міліцыянта паставіў дыягназ, што Толік ужо як мінімум тыдзень не ўжываў спіртнога, афіцэр КДБ узрадаваўся яшчэ больш.*

*— Ды тут усе падкупленыя. Мы раскрылі цэлую мафію. Дзіраўце хлопцы яшчэ і мундзіры для ордэнаў. А Загорскага ў паліклініку КДБ. Там зробяць праўдзівы аналіз.*

*Але калі і там доктар пацвердзіў, што міліцыянт цвярозы як шкло ў аго акулярах, кадэбэшнік зароў як звар'яцелы бізон:*

*— Мы ж самі бачылі як гэты гад выдуў дзве бутэлькі.*

*— Вашых сведчанняў замала, каб склеіць справу, — сумна адказаў доктар. — Прыйдзецца Загорскага адпусціць.*

*Хвілін праз пяцьдзесят Загорскі зноў завітаў у буфет.*

*— Толічак! — узрадавалася буфетчыца. — Адпусцілі цябе тыя злыдні. А я так перажывалася, так маркоцілася...*

*— Не было чаго, — хмура адказаў Загорскі. Я вынайшаў такую сістэму як браць хабар, што Эйнштэйн са сваёй тэорыяй адноснасці прызнаў бы інтэлектуальную паразу. Лепш давай грошы. Колькі там мы сёння накасілі.*

*— Як заўсёды, Толічак. І як заўсёды дваццаць адсоткаў мае.*

*Загорскі палічыў грошы, сунуў іх у кішэнь і папрасіў наліць каньяку. Але як толькі ўзяў у рот, скрывіўся і выплюнуў вадкасць на падлогу.*

*— Ты што мне наліла, дурная баба! — Зароў ён. — Я казаў каньяку, а не гэтай зафарбаванай пад каньяк вады, якую я мушу піць літрамі штодзённа.*

**Сымон Нальшанскі**

# Гадавіна знікнення Захаранкі

7 мая ў цэнтры Варшавы сябры Звязу на карысць дэмакратыі ў Беларусі наладзілі пікет, прысвечаны гадавіне знікнення Юрыя Захаранкі.

Актывісты ЗДБ наладзілі своеасаблівы пэрформанс — чалавек, пераапрануты ў Лукашэнку, у вайсковым мундзіры і касцы, ходзіць вайсковым крокам з аркушамі паперы, дзе, прыкладам, напісана: „Я не парушаю правы чалавека”, „Я не зачыняю незалежныя газеты”, „Я не пераследую апанентаў рэжыму” і „Я не нішчу беларускую культуру”. Потым, калі гэтыя аркушы перагортваюцца, дык бачна, што з другога боку напісана: „Я не маю з гэтым нічога супольнага”.






Як паведаміў А. Цялежнікаў, адзін з арганізатараў акцыі, „напачатку было брыдкае надвор’е, ішоў дождж і апошняга дыктатара Еўропы вымушаны быў суправаджаць чалавек з парасонам, каб той не прамок. Але потым, калі пачалі збірацца людзі, разгортваць плакаты, сцягі, то неба праяснілася, з’явілася сонца”.

Таксама каля двух дзесяткаў удзельнікаў акцыі раздавалі мінакам матэрыялы з інфармацыяй пра знікненні апанентаў беларускага рэжыму, трымалі бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты з надпісамі: „Мы памятаем пра ахвяры рэжыму Лукашэнкі” ды іншыя.

Каля пікетчыкаў спыняліся людзі, нават патрапіла некалькі групаў беларускіх турыстаў. Постаць Лукашэнкі ў Варшаве выклікала ў іх усмешку. Як заўважылі ўдзельнікі акцыі, пазнавалі іх, як беларусаў, па-нацыянальным бел-чырвона-белым сцягу.




# Памяці Булак-Балаховіча



10 траўня 2005 года ў Варшаве была ўшанавана памяць генерала Станіслава Булак-Балаховіча. Актывісты Звязу на карысць дэмакратыі і супрацоўнікі Фонду „Беларусь” усклалі кветкі і запалілі знічы памяці каля памятнай дошкі Станіслава Булак-Балаховіча.

На акцыі ўшанавання памяці прысутнічаў унук генерала Станіслаў Булак-Балаховіч (на здымку). Ён выступіў перад прысутнымі і распавёў пра свайго дзеда, пра яго жыццё, дзейнасць і смерць. Генерал Булак-Балаховіч загінуў 10 траўня 1940 года ў Варшаве падчас перастрэлкі з гестапаўцамі.

Унук славутага беларуса быў вельмі ўзрушаны тым, што беларуская грамада ў Польшчы памятае пра Станіслава Булак-Балаховіча. На заканчэнне быў праспяваны гімн „Магутны Божа”.

Пасля акцыі адбылася сяброўская размова і быў запланаваны шэраг акцый у гонар генерала Станіслава Булак-Балаховіча ды іншых герояў беларускай нацыі.

Народ павінен ведаць сваіх герояў! Без мінулага няма будучыні! Для ўсіх беларусаў паведамляем месца знаходжання ганаровай шыльды Станіслава Булак-Балаховіча: ul. Paryska, 27, Warszawa.

# Украінцы вярнуліся з Беларусі ненадоўга

Пяць сяброў Нацыянальнага альянсу — старшыня НА Ігар Гузь, сябры арганізацыі Аляксандр Машлай, Андрэй Бокач, Андрэй Грымалюк і Аляксей Панасюк, якія вярнуліся з беларускага зняволення, правялі прэс-канферэнцыю, дзе абвясцілі аб планах Нацыянальнага альянсу ў накірунку ўкраінска-беларускага супрацоўніцтва паміж патрыятычнымі арганізацыямі.

Нацыянальны альянс патрабуе адмяніць забарону на ўезд у Беларусь для сваіх сяброў. Ігар Гузь заявіў, што пасля ўсіх падзей найбольшае абурэнне выклікае дэпартацыя і забарона на ўезд у Беларусь на 5 гадоў — менавіта такі штамп пастаўлены ў пашпартах пяці ўкраінскіх грамадзян. Ігар Гузь паведаміў, што плануе сустрэцца з міністрам замежных спраў Барысам Тарасюком. Мэтаю сустрэчы будзе падзяка за прынцыповую пазіцыю МЗС наконт затрыманых украінцаў і абмеркаванне шляху скасавання забароны на ўезд у Беларусь.

Будзе створаны ўкраінска-беларускі цэнтр супрацоўніцтва. Сябры Нацыянальнага альянсу паведамілі аб ініцыятыве стварэння ўкраінска-беларускага цэнтра супрацоўніцтва, які будзе каардынаваць працу ўкраінскіх і беларускіх грамадскіх арганізацый, будзе арганізоўваць навучанне беларускай апазіцыйнай моладзі, будзе лабіраваць месцы ў ВНУ Украіны для маладых актывістаў беларускай апазіцыі, якія былі рэпрэсаваны і адлічаны з ВНУ ў Беларусі, будзе падрыхтоўваць назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары 2006 года, будзе займацца падрыхтоўкай кандыдатаў у дэпутаты на мясцовых выбары. У планах цэнтра — стварэнне інфармацыйнага сайта для ўкраінцаў аб Беларусі і для беларусаў пра Украіну.

Нацыянальны альянс у хуткім часе зноў наведае Беларусь. Як паведаміў Аляксандр Машлай, неўзабаве ў Беларусь зноў адправіцца дэлегацыя Нацыянальнага альянсу. Мэтаю паездкі будзе працягванне наладжвання супрацоўніцтва з беларускімі грамадскімі асяродкамі. Што гэта за асяродкі, Нацыянальны альянс не хоча разгалошваць раней часу, каб беларускі КДБ не ўжыў дзеянняў для сабатажу паездкі.

14-16 траўня ў Польшчы адбыліся Дні Еўропы, у святкаванні якіх прынялі ўдзел Нацыянальны альянс і Малады фронт. У тыя ж самыя дні ў Варшаве былі падпісаны дамовы аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным альянсам, Маладым фронтам і шэрагам польскіх праваабарончых арганізацый.

Сустаршыня беларускага Маладога фронту Зміцер Дашкевіч, які быў затрыманы разам з украінцамі 26 красавіка, наведае Украіну. Мэтаю паездкі будзе пашырэнне супрацоўніцтва паміж дзвюма арганізацыямі, акрэсленне дакладных планаў супрацоўніцтва, абмен вопытам. Таксама лідэр Маладога фронту правядзе шэраг сустрэч з прадстаўнікамі іншых украінскіх арганізацый.

*Ігар Шчэкарэвіч,*
*Інфармацыйны аддзел*
*Нацыянальнага альянсу*

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 824 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2005 r. upływa 5 czerwca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Там по маёвуй росі

**II Фестываль Веснавога Фальклору**
**Бельск-Падляшскі – Студзіводы, 3-6.06.2005**

**3 чэрвеня (пятніца)**

13.00 Музей у Бельску-Падляшскім — ратуша: Адкрыццё выстаўкі „Народны строй беларусаў Падляшша” • выступленне запрошаных гасцей фестывалю;

17.00 Музей Малой Айчыны ў Студзіводах: Адкрыццё фестывалю • карагод калектываў вуліцамі Студзіводаў;

18.30 Навука традыцыйных танцаў у суправаджэнні народных музыкаў.

**4 чэрвеня (субота)**

16.00 Музей Малой Айчыны ў Студзіводах: Канцэрт традыцыйных веснавых і іншых песень; выступаюць м.інш. Доброслаўка (Палессе, Пінскі раён), Марыя Сарока (Палессе, Жабінкаўскі раён), Кудзьмень (Мінск), Іліінская Пятніца (Рыга), Од Познаня (Познань) ды гурты з Падляшша — Добрывода, Орэшково, Маліннікі, Тыневічы, Курашэво, Дашы, Збуч, Плёскі, Антракт (Бельскі Дом Культуры) і Жэмэрва (Музей Малой Айчыны ў Студзіводах).

**5 чэрвеня (нядзеля)**

13.00 Музей Беларускай Культуры ў Гайнаўцы: Выступленне фестывальных гасцей на этнаграфічным фэсце.

**6 чэрвеня (панядзелак)**

10.00 Музей Малой Айчыны ў Студзіводах: Адкрыты метадычны семінар для настаўнікаў „Як навучаць традыцыйнага фальклору?”; вядучыя: Сяргей Аленкін (Рыга), Ірына Мазюк (Мінск).

# Чом по маёвуй росі?

Там по маёвуй росі, Ясь конічэнька пасэ
Ой пасэ вуон пасучы вэсёло співаючы
Ештэ конікі травку, зэлёну муравку,
Здроёву воду піетэ, і в доруожэньку йдетэ...

*Так почынаецце одна з найхорушчых піеснюв Пудляша. Нэ туолькі найхорушчых, але і найстарыейшых. Нашы продкі співалі еі вэсною, колі на траву почала выпадаті маёва роса. А вона вважаласе за здорову і гоючу. Ею обмывалі своіе твары, ногі. По юой можна было ходіті босяком. Такі жэ е і дошч маёвы. Разом з сонейком ожывляе вуон прыроду, рослінам пудкрэпляе сілы і дае залог на добры плён.*

*Такім добрым плёном обэрнуласе і маёвая задума року Божого 2003, колі в Музеёві Малойі Батькувшчыны в Студзіводах показуваліce мешчанскі пісанкі, а пры іх Крывчанкі і Орыешкі співалі своіе стародавні огулькі — вэсновые корогодны пісніе, якіе колісь на Пудляшу было кругом чуті од Вэлікодня до Провуод. Тогды і повстала задума, коб кожды рук збіратісе в Студзіводах порадоватісе вэсняными піеснямі, корогодамі, обрадамі. І так, в прошлум рокові одбывсе тут пэршы фестываль вэсняного фольклёру. Накіровaны вуон пэрш за всё на традыцыі білорусув Пудляша і Полесся, якіе творат одін культурны арэал, во мнуогом одінаковы, але і руожнородны. Дэ співают огулькі, а дэ бородайкі... Дэ качают коровая, а дэ водят куста... Колі глянэмо шчэ на вэсновые пісніе і традыцыі суседув, побачым, як всё тое разом взятэ творыт вэліку народну опэру.*

*З 3 по 6 чэрвеня сёго року, наш музей знов організуе фестываль «Там по маёвуй росі». Запрашаемо всіех, кому мілы традыцыйны пісніе і обряды, хто хочэ поспіваті одкрытым голосом і поучытісе танцюв пуод музыку полеськуй капэлі. Можна будэ тожэ побачыті, як колісь одягалісе білорусы Пудляшша. Вышэй подаем докладну програму фестывалю. Прыгадаю, што фестываль і выставка одбываюцце в рамках рэалізацыі програмы стыпендыі Маршала Пудляского Воеводтва на 2005 р.*

**Дорофей ФІЁНІК**



XXIV Międzynarodowy Festiwal Muzyki Cerkiewnej — Hajnówka 2005
XXIV International Festival of Orthodox Church Music

**PROGRAM FESTIWALU**

2005.05.24 (wtorek)
godz. 18.00, Filharmonia Białostocka
Otwarcie Festiwalu, otwarcie wystawy fotograficznej „Słońce” Wiktora Wołkowa
Koncert Inauguracyjny „Wielcy kompozytorzy Wschodu w duchowym i artystycznym dziedzictwie Wielkiego Księstwa Litewskiego”: Piotr Czajkowski — „Liturgia wg św. Jana Złotoustego” op. 41 — wersja koncertowa, polskie prawykonanie;
Koncert w wykonaniu laureatów MFMC: Akademickiego Chóru „Bel Canto” z Olsztyna pod dyr. Jana Połowianiuka, Chóru Kameralnego „Brevis” z Wilna (Litwa) pod dyr. Gintautasa Venislovasa

*PRZESŁUCHANIA KONKURSOWE*

2005.05.25 (środa)
godz. 17.00, Filharmonia Białostocka
„Kwartet Poznański” — Poznań • Chór Mieszany „Akord” — Mielec • Akademicki Chór Akademii Medycznej w Lublinie • Stowarzyszenie Śpiewacze „Harmonia” — Łódź • Chór Kameralny im. Zofii Kurowskiej — Słupsk • Chór Akademicki Uniwersytetu w Białymstoku

2005.05.26 (czwartek)
godz. 17.00, Filharmonia Białostocka
Chór „Collegium Scholarum Mediarum” — Liberec (Czechy) • Żeński Chór „Na’ama” — Givat Ada (Izrael) • Dziecięcy Chór „Raduga” — Tallin (Estonia) • Chór Pracowników Politechniki Białostockiej „Psalmodia” — Białystok • Chór „Widrodżennia” — Kriwyj Rih (Ukraina) • Akademicki Chór Państwowego Uniwersytetu w Omsku (Rosja)

2005.05.27 (piątek)
godz. 17.00, Pałac Branickich
Zespół Psalmistów Staroobrzędowców „Kiteż” — Jekabpiłs (Łotwa) • Chór Cerkwi Św. Mikołaja — Lwów (Ukraina) • Chór Cerkwi Św. Pietki — Płowdiw (Bułgaria) • Chór Parafii Greckokatolickiej — Vranow nad Toplou (Słowacja) • Śpiewacy Soboru Św. Pantelejmona — Tbilisi (Gruzja) • Chór Monasteru Św. Teodora — Kiszyniów (Mołdawia) • Chór „Św. Simeon Bogoprimac” — Smederevska Palanka (Serbia i Czarnogóra)

2005.05.28 (sobota)
godz. 17.00, Filharmonia Białostocka
Jubileuszowy Koncert Autorski „Wschód i Zachód w muzyce Romualda Twardowskiego”; wykonawcy: Białostocki Chór Kameralny „Cantica Cantamus”, Orkiestra Symfoniczna Filharmonii Białostockiej, Mirosław Jacek Błaszczyk — dyrygent, Leonard Andrzej Mróz — bas
godz. 18.00 — przesłuchania
Młodzieżowy Chór Kameralny „Accolada” — Ryga (Łotwa) • Chór „Chorodia Konstantinoupoliton” — Ateny (Grecja) • Kameralny Chór „Iwan Spasow” — Płowdiw (Bułgaria) • Męski Chór Prawosławnego Bractwa ku czci Arcystratega Michała — Mińsk (Białoruś) • Kameralny Chór „Credo” — Kijów (Ukraina) • Uralski Państwowy Chór Kameralny — Perm (Rosja) • Kameralny Chór Filharmonii Narodowej Republiki Mołdawii — Kiszyniów (Mołdawia)

*ZAKOŃCZENIE FESTIWALU*

2005.05.29 (niedziela)
godz. 14.30, Filharmonia Białostocka
ogłoszenie werdyktu Jury i wręczenie nagród • godz. 16.00 — Koncert Galowy

# Адгаданка

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | |

## *Шыфраграма*

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — народную прыказку.

1. карысць, прыбытак = 12 _ 4 _ 5 _ 11 _ 3 _ 2 _;
2. прамежак часу ў дзесяць дзён = 23 _ 22 _ 24 _ 25 _ 34 _ 33 _;
3. муж дачкі, які любіць узяць = 26 _ 9 _ 17 _ 18 _;
4. вадкасць, якая выдзяляецца падскурнымі залозамі ў час напружанай працы або гарачыні = 10 _ 6 _ 1 _;
5. музычны клавішны інструмент з гарызантальнымі струнамі = 21 _ 13 _ 19 _ 31 _ 39 _;
6. чорная ў коміне = 28 _ 27 _ 14 _ 15 _;
7. дзесяць дзесятак = 32 _ 29 _ 30 _;
8. моцны холад, мароз = 7 _ 8 _ 16 _ 35 _ 36 _;
9. вялікая звязка саломы або сена = 38 _ 37 _ 20 _;

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 15 нумара**

Разрэз, цыбуля, ярмо, чорт, Гюго, Ева, Эмс, кума, кетон, Ельцын, крыло, вятрак.

Рашэнне: **З бярозы цячэ многа соку — лета мокрае.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

# 22.05 – 28.05



**Баран (21.03. — 19.04.)** Не дай захапіцца раўніваму каханню. 21 — 25.05. можаш ублытацца ў раман, які ўскладніць табе жыццё. Запісвай свае сны.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Ненайлепшыя кантакты з людзьмі, якіх хочаш зманіпуляваць. Атрымаеш падарунак ад лёсу. Час выкарыстоўвай на рэалізацыю найцяжэйшых задач, бо шчасце спрыяе табе (дарэчы, увесь месяц) ва ўсім, да чаго дакранешся.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Секстыль Меркурыя да Сатурна (23 — 27.05.) патольна падзейнічае на тваe нервы. Спакойныя і адказныя дзеянні. Асаблівая кемлівасць. Яснасць інтэлекту паможа разблытаць складаныя справы і пазмагацца з выклікам, які паставіць перад табою жыццё.

**Рак (22.06. — 22.07.)** У поўню Месяца будзеш у стрэсе і можаш імпульсіўна рэагаваць. Твая празмерная ўражлівасць залезе за скуру атачэнню! Праз твой дом правінецца шмат людзей.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Фантастычная канцоўка месяца! Радасны аптымізм, шчаслівыя выпадкі. Знакаміта справішся з экзаменамі. Калі кепска сябе адчуваеш, адразу бяжы да лекара.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Да 24.05. вялікая рассеянасць. Добра дагаворышся з мужчынамі. Пачнеш займацца справамі, якія дагэтуль цябе не цікавілі, магчыма — як валанцёр ці дабрадзей.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** 22 — 26.05. знойдзеш час, каб пайсці на канцэрт ці выстаўку; творы, з якімі сутыкнешся, пакінуць у табе трывалы след. Да 25.05. бурлівыя сваркі з партнёрам (галоўная прычына — твае прафесійныя рашэнні).

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Да 25.05. — празмерная амбітнасць можа табе пашкодзіць. Можаш нарабіць сабе ворагаў, калі захочаш зашмат. Пасля 27.05. будзь асцярожным са знаёмствамі, асабліва калі шукаеш суполку ў інтарэсах.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Таленты, умеласць і файныя рысы характару пакажаш пад канец тыдня. Свабодныя Стральцы могуць мець вялікі поспех у другога полу. Камфорт сярод сяброў.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Калі маеш для апрацоўкі нейкі складаны дакумент, зрабі гэта 23 — 27.05., цярплівасць, добры час для падрыхтоўкі да экзаменаў. Можаш добра пахудзець.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Не сцерпіш вязяў і абмежаванняў, хутка іх парвеш, але і хутка заблытаешся ў іншых абдымках. Грошы палюбяць цябе на даўжэй. Пошукі ўласнай тоеснасці. Уважліва слухай свой унутраны голас.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Ідылія ў парах; спадзявайся большага, чым вячэры пры свечках. Да 24.05. хтосьці свядома захоча цябе ўвесці ў зман. Калі не мусіш, не плануй падарожжаў, асабліва калі ты цяжарная Рыба. Патрэбны табе радасны рух і змены.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960